ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выд. 32-і
№ 4 (1849)
14 студзеня 1964 г.
АЎТОРАК
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

ПАВЕДАМЛЕННЕ

АБ СКЛІКАННІ ПЛЕНУМА ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТА КПСС

ЦК КПСС прыняў рашэнне склікаць чарговы Пленум Цэнтральнага Камітэта КПСС 10 лютага 1964 года.

На абмеркаванне Пленума ЦК уносіцца пытанне «Аб інтэнсіфікацыі сельскагаспадарчай вытворчасці на аснове шырокага выкарыстання ўгнаенняў, развіцця арашэння, комплекснай механізацыі і ўкаранення дасягненняў навукі і перадавога вопыту для хутчэйшага павелічэння вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі».

Дакладчыкам зацверджан міністр сельскай гаспадаркі СССР тав. Валоўчанка І. П.

Садакладчыкі па гэтаму пытанню ад саюзных рэспублік— міністры сельскай гаспадаркі.

ПЛЕНУМ ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТА КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ БЕЛАРУСІ

10 студзеня 1964 года адкрыўся пленум Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Беларусі.

На пленум былі запрошаны першыя і другія сакратары абкомаў КПБ, старшыні абвыканкомаў, што не ўваходзяць у састаў Цэнтральнага Камітэта, сакратары абкомаў партыі, якія займаюцца пытаннямі ідэалагічнай работы, першыя сакратары гаркомаў і гаррайкомаў КПБ, сакратары прамыслова-вытворчых парткомаў, сакратары парткомаў вытворчых калгасна-саўгасных упраўленняў, начальнікі вытворчых калгасна-саўгасных упраўленняў, старшыні выканкомаў гарадскіх і раённых Саветаў дэпутатаў працоўных, загадчыкі прамысловых, будаўнічых, сельскагаспадарчых аддзелаў і аддзелаў партыйных органаў абкомаў КПБ, начальнікі абласных упраўленняў вытворчасці і нарыхтовак сельгаспрадуктаў, старшыні абласных аб'яднанняў «Белсельгастэхніка», дырэктары абласных сельскагаспадарчых даследных станцый, начальнікі абласных упраўленняў бытавога абслугоўвання і мясцовай прамысловасці, старшыні абласных саветаў прафсаюзаў, першыя сакратары абкомаў камсамола, кіраўнікі і адказныя работнікі рэспубліканскіх міністэрстваў і ведамстваў, вучоныя, сакратары партарганізацый, дырэктары, галоўныя інжынеры і спецыялісты прадпрыемстваў хімічнай і лёгкай прамысловасці, будаўнічых арганізацый і навукова-даследчых устаноў, дырэктары саўгасаў і старшыні калгасаў, перадавікі прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці — усяго каля 1 200 чалавек.

З дакладам «Аб выніках снежаньскага (1963 г.) Пленума ЦК КПСС і мерах па выкананню пастановы Пленума «Паскоранае развіццё хімічнай прамысловасці — важнейшая ўмова ўздыму сельскагаспадарчай вытворчасці і росту дабрабыту народа» выступіў кандыдат у члены Прэзідыума ЦК КПСС, першы сакратар ЦК КП Беларусі тав. К. Т. Мазураў.

У спрэчках па дакладу выступілі: А. Б. Насілоўскі — першы сакратар Мінскага прамысловага абкома КПБ; У. Ф. Міцкевіч — першы сакратар Гродзенскага сельскага абкома КПБ; А. Ф. Рэзнікаў — старшы аператар устаноўкі атмасферна-вакуумнай трубчаткі Полацкага нафтаперапрацоўчага завода; І. Я. Палякоў — першы сакратар Гомельскага сельскага абкома КПБ; В. Ф. Языковіч — першы сакратар Гродзенскага прамысловага абкома КПБ; С. Г. Скарапанаў—міністр сельскай гаспадаркі БССР; П. Н. Зярноў — галоўны інжынер Магілёўскага завода штучнага валакна; У. Б. Труноў — першы сакратар Віцебскага прамысловага абкома КПБ; І. М. Жыжаль — міністр будаўніцтва БССР; У. П. Самсонаў — начальнік Міёрскага вытворчага калгасна-саўгаснага ўпраўлення; С. М. Кішкін — старшыня Саўнаргаса БССР; Я. Д. Летачэўскі — першы сакратар Гомельскага прамысловага абкома КПБ; С. М. Малінін—старшыня Дзяржплана БССР.

* * *

11 студзеня на пленуме Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Беларусі працягвалася абмеркаванне даклада тав. К. Т. Мазурава «Аб выніках снежаньскага (1963 г.) Пленума ЦК КПСС і мерах па выкананню пастановы Пленума «Паскоранае развіццё хімічнай прамысловасці — важнейшая ўмова ўздыму сельскагаспадарчай вытворчасці і росту дабрабыту народа».

У спрэчках выступілі: У. А. Мікуліч — першы сакратар Брэсцкага сельскага абкома КПБ; Л. Г. Максімаў — першы сакратар ЦК ЛКСМБ; П. Ф. Казлова — аграном калгаса «Кастрычнік» Хойніцкага вытворчага калгасна-саўгаснага ўпраўлення; І. М. Макараў — старшыня Беларускага рэспубліканскага савета прафесіянальных саюзаў; В. Ф. Купрэвіч — прэзідэнт Акадэміі навук БССР; У. Е. Лабанок — першы намеснік Старшыні Савета Міністраў БССР, міністр вытворчасці і нарыхтовак сельгаспрадуктаў БССР; І. Д. Янкоўскі — старшыня калгаса «40 гадоў Кастрычніка» Столінскага вытворчага калгасна-саўгаснага ўпраўлення; У. А. Кароль — старшыня Дзяржкамітэта Савета Міністраў БССР па справах будаўніцтва і архітэктуры; В. М. Левін—дырэктар Віцебскай абласной даследчай сельскагаспадарчай станцыі; А. І. Ціханаў — начальнік Упраўлення хімічнай прамысловасці Саўнаргаса БССР.

З заключным словам выступіў кандыдат у члены Прэзідыума ЦК КПСС, першы сакратар ЦК КПБ тав. К. Т. Мазураў.

Па абмеркаванаму пытанню пленум аднагалосна прыняў пастанову.

Пленум разгледзеў арганізацыйныя пытанні.

Пленум зацвердзіў загадчыкам аддзела партыйных органаў ЦК КПБ тав. М. Н. Полазава; загадчыкам ідэалагічнага аддзела ЦК КПБ тав. А. Т. Кузьміна; загадчыкам аддзела навукі і культуры ЦК КПБ тав. М. Ф. Капіча; загадчыкам аддзела хімічнай, лёгкай прамысловасці і гандлю ЦК КПБ тав. Я. А. Мікуловіча; загадчыкам аддзела прамысловасці, якая перапрацоўвае сельскагаспадарчую сыравіну, і гандлю ЦК КПБ тав. А. І. Ярэя.

Пленум зацвердзіў намесніка загадчыка аддзела партыйных органаў ЦК КПБ, загадчыка пададдзела партыйных органаў па кіраўніцтву прамысловасцю і будаўніцтвам тав. М. Ф. Мішчанку і намесніка загадчыка ідэалагічнага аддзела ЦК КПБ — загадчыка пададдзела прапаганды і агітацыі ў прамысловасці і будаўніцтве тав. У. В. Мацвеева членамі Бюро ЦК КП Беларусі па кіраўніцтву прамысловасцю і будаўніцтвам.

Першы намеснік загадчыка ідэалагічнага аддзела ЦК КПБ, загадчык пададдзела прапаганды і агітацыі ў сельскай гаспадарцы тав. С. М. Пуцылеў зацверджан членам Бюро ЦК КП Беларусі па кіраўніцтву сельскай гаспадаркай.

Пленум зацвердзіў тав. А. К. Зініна рэдактарам газеты «Советская Белоруссия».

З вялікім натхненнем удзельнікі пленума прынялі пісьмо Цэнтральнаму Камітэту КПСС.

Пленум закончыў сваю работу.

У ГЭТЫМ НУМАРЫ

● ПА ЗАЛАХ МАСТАЦКАЙ ВЫСТАЎКІ ● У ГАСЦЯХ У РЭДАКЦЫІ — КЛУБ ВЕТЭРАНАЎ ● АБ НОВЫМ РАМАНЕ І. ШАМЯКІНА ● НАТАТКІ ПРА ДЗЕЙНАСЦЬ АГІТБРЫГАДЫ ● РЭЦЭНЗІЯ НА СПЕКТАКЛЬ БРЭСЦКАГА ТЭАТРА ● ЧАСОПІСЫ У СТУДЗЕНІ

РЭСПУБЛІКАНСКАЯ МАСТАЦКАЯ ВЫСТАЎКА

ТВОРЧЫ НАСТРОЙ

Эдзі АГНЯЦВЕТ

Напэўна, у многіх людзей бывае адчуванне, падобнае да майго: як бы ні стамілася я, якія б непрыемнасці ні перажыла, але варта паслухаць добры музычны твор, ці паглядзець на мастацкую карціну — і на душы становіцца светла, хораша.

У нядзелю, пасля даволі напружанага працоўнага тыдня, я пайшла на новую выстаўку твораў беларускіх мастакоў.

Чым парадуюць сябры-мастакі? Што іх трывожыць і хвалюе, якія новыя тэмы ўвайшлі ў сэрцы, якія новыя фарбы і адценні з'явіліся на палітры?

На выстаўцы — работы прадстаўнікоў розных пакаленняў. Самы старэйшы яе ўдзельнік — народны мастак В. Волкаў — 1881 года нараджэння; самы малодшы — графік С. Бернштэйн — 1941 года нараджэння. Роўна шэсцьдзесят год аддзяляюць аднаго ад другога.

Радуе, што новыя работы нашых мастакоў ідуць ад жывога жыцця, ад палымянай улюбёнасці ў нашу сучаснасць, у людзей-будаўнікоў камуністычнай будучыні, у родную прыроду.

У творчасць мастакоў прыйшлі нашы сучаснікі, гордасць рэспублікі: механізатар В. Жэўжык (скульптар С. Селіханаў), Герой Сацыялістычнай Працы Маліноўскі (мастак Я. Зайцаў), лётчык-герой А. Алялюхін і цудоўны хірург Ю. Лось (мастак В. Волкаў), брыгадзір Фандо (мастак Н. Воранаў), брыгадзір Полацкага нафтабуда Н. Гушча (мастак Ул. Кухараў-, салігорскі шахцёр Каваленка (мастак В. Пратасеня), ткачыха Міхалап (мастак А. Шаўчэнка) і іншыя.

Запамінаюцца партрэт Ул. Маякоўскага (скульптар П. Белавусаў) і скульптура паэта работы А. Анікейчыка. Кожны з гэтых мастакоў прымусіў загаварыць матэрыял.

Удачай скульптара Г. Мурамцава з'яўляецца, на маю думку, партрэт Сяргея Дзяргая (дрэва). Умела перададзены выразныя, характэрныя рысы твару паэта.

Хвалююць палотны М. Савіцкага «Партызаны» і Х. Ліўшыца «Янка Купала і Кузьма Чорны ў Печышчах у 1942 годзе».

Тэма сучаснасці гучыць у такіх творах, як «Будаўнікі» Ю. Пучынскага, «Украіны Мінска» П. Масленікава. І ўсё ж мала на выстаўцы ўдалых шырокіх сюжэтных палотнаў, прысвечаных тэмам сённяшняга жыцця. Аўтар досыць добрага, запамінальнага партрэта ткачыхі Міхалап — мастак А. Шаўчэнка не зак разгубіўся, калі звёў сваіх герояў разам у карціне «Новае заданне». Вобразы атрымаліся статычнымі, неэмацыянальнымі. Карціна не хвалюе.

Магчыма, гэта чыста суб'ектыўнае ўражанне.

Мне вельмі хацелася б, каб людзі ў новых сюжэтных творах выглядалі на шырокіх палотнах сапраўднымі людзьмі, жывымі людзьмі — з гарачымі чалавечымі пачуццямі, а не ружовымі, прыгладжанымі прыгажунамі і прыгажунямі.

Добрае ўражанне пакідаюць карціны, прысвечаныя дзецям. Вось палатно В. Жолтак «У школу».

Вясна. Разводдзе. Дзе-нідзе сляды на снезе, на ўзгорках жаўцее леташняя трава. Над лясной рэчкай перакінуты лёгкі драўляны мост, па ім ідуць дзеці. На бэзавашэрым, светла-блакітным фоне неяк асабліва святочна выглядаюць фігуркі малых школьнікаў у чырвоных, сініх, зялёных, жаўтавата - зялёных шубках. Колькі ў гэтай карціне паветра, святла, руху, радасці! І не дзіўна, што людзі зноў і зноў вяртаюцца да «кутка» Жолтак. Вабіць і яе светлая, шчырая кампазіцыя «Сяброўкі».

...А вось басаногія дзяўчаткі і хлапчукі. Яны вельмі розныя і характэрныя, — прыселі на хвілінку на лаўку, пэўна, стаміліся пасля вясёлых, шумных гульняў. Гэта карціна «У нас на двары» мастака Я. Харытоненкі, якому належыць партрэт «Віця». Кім ён будзе, гэты разумны, ясны хлапчук з сінявата-шэрымі вачыма? Можа, гэта будучы касманаўт? Такое меркаванне падказваюць глыбокія сінія фарбы, якімі насычана карціна. Яны ўдала кантрастуюць з ярка-аранжавым колерам апельсінаў.

З любоўю да нашых дзяцей напісаны работы А. Волкава «Юныя мінчане» і А. Гугеля «Рыбакі».

І калі ўжо гаварыць аб другой пары чалавечага жыцця — юнацтве, нельга абмінуць скульптуру А. Глебава, якая так і называецца «Юнацтва» (дрэва).

Быў час, калі мастакі палохаліся паказу адкрытага чалавечага цела, забываючы аб выдатным мастацтве, напрыклад, старажытных грэкаў. Успамінаецца адзін парадаксальны выпадак. Гэта было гадоў дзесяць назад. На адной прафсаюзнай нарадзе выступіў інспектар, якому было даручана праверыць работу Мінскага мастацкага вучылішча. Ён з абурэннем гаварыў пра тое, што будучыя мастакі малююць купальшчыц; аратар выступаў супраць такой «разбэшчанасці».

Гармонія, чысціня і хараство юнацтва ярка ўвасоблены ў новай глебаўскай рабоце.

Спелым майстэрствам адзначаны карціны, прысвечаныя беларускай прыродзе.

Калі я гляджу на работы «Прыпяць» В. Цвірко, «Халодны вечар» Г. Азгур, «Уранку» І. Ахрэмчыка, «Ля Заходняй Дзвіны» А. Шыбнёва — на нейкі момант забываю на тое, што гэта — творчасць мастакоў. Пейзажы, розныя па характары, фарбах і стылі, успрымаюцца як прывабныя куткі і прасторы нашай Беларусі. Мне хочацца пайсці на прывольны бераг Прыпяці, дыхаць свежым паветрам халоднага вечара. Мне хочацца складаць песню яснаму ранку і вандраваць уздоўж шэра-блакітнай Заходняй Дзвіны. А хіба ж не ўсхвалююць і пейзажы П. Масленікава «Мінскае мора», А. Кроля «Снег растае».

Разнастайна і багата прадстаўлена на выстаўцы графіка. Ніяк нельга абмінуць тонкую лірыку твораў А. Паслядовіч, выдатныя ілюстрацыі да кніг для дзяцей А. Кашкурэвіча і Б. Заборава (асабліва, «Ад казкі да казкі»).

Наведвальнікі выстаўкі, асабліва жанчыны (у тым ліку і я), з вялікай цікавасцю разглядалі творы прыкладнога мастацтва. Кераміка, шкло, дрэва: тут можна знайсці шмат прыгожых, тонкіх вырабаў, якія радуюць вока і душу.

Пакідаючы мастацкую выстаўку, адчуваеш: нарадзіўся ў душы добры, творчы настрой. Я стала багацейшай ад таго, што ўбачыла столькі прыгажосці.

З РЭСПУБЛІКАНСКАЙ МАСТАЦКАЙ ВЫСТАЎКІ. А. ШМАКАЎ (Брэст). Партрэт Героя Сацыялістычнай Працы Л. І. Асіюк (гіпс).

ВІНШУЕМ З УЗНАГАРОДАЙ

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР за заслугі ў развіцці савецкай музыкі і ў сувязі з сямідзесяцігоддзем з дня нараджэння кампазітар ЦІКОЦКІ Яўген Карлавіч узнагароджан ордэнам «Знак пашаны».

Я. ГЕРЦОВІЧ

ЗОСЯ САВІЧ І ІНШЫЯ

Вайна не можа быць далёкай гісторыяй для адзінокай удавы, чыё шчасце навекі пахавана ў магіле невядомага салдата: для маці, якая страціла сына; для ўсіх, хто зведаў, што такое фашысцкі «новы парадак». Лягчэй залячыць раны на целе зямлі, чым траўмы душэўныя. За кароткі час мы адбудавалі зруйнаваныя ворагам гарады і вёскі, далі новае жыццё заводам і фабрыкам, перасталі ўспамінаць пра зямлянкі. А раны ў сэрцах людзей хоць і зарубцаваліся, але напамінаць аб сабе ніколі не перастануць. І вельмі добра, што новы раман Івана Шамякіна «Сэрца на далоні» («Полымя» №№ 8—10 за 1963 год) адрасуецца да людскога сумлення, напамінае пра неабходнасць шанаваць памяць кожнага чалавека, які загінуў у баях з фашысцкімі захопнікамі.

Пісьменнік кранае самыя глыбокія душэўныя струны, струны, якія не могуць не адгукнуцца. Аднак толькі творчае смеласці для гэтага мала, патрэбна яшчэ надзвычайная чуласць да чалавека і яго перажыванняў. Асабліва ўважліва трэба падыходзіць да ўдзельнікаў вайны, імёны якіх зганьбаваны рознага роду перастрахоўшчыкамі і чакаюць сваёй рэабілітацыі. Гісторыя аднаго такога патрыёта і знайшла адлюстраванне на старонках рамана.

Чытаецца раман з неаслабнай увагай, якая расце з кожнай старонкай. А потым, калі пачынаеш аналізаваць, чым жа аўтар бярэ цябе за жывое, узнікае жаданне і падтрымаць пісьменніка, і часам паспрачацца з ім.

І. Шамякін старанна клапаціўся аб займальнасці свайго твора, і гэта добра. Над такой кнігай не заснеш, яна цябе інтрыгуе героікай і таямніцамі колішняга антыфашысцкага падполля, у прыватнасці, загадкавасцю чалавечага лёсу прафесара Савіча, які працаваў пры немцах у інфекцыйнай бальніцы, не ўхіляўся ад дапамогі савецкім патрыётам і загінуў невядома ад чыёй рукі. Фашысты растрэлялі ў сваіх газетах, што прафесара пакаралі партызаны. Версія аб здрадніцтве Савіча была потым падтрымана і ў мемуарах аднаго з былых кіраўнікоў антыфашысцкага падполля. Вось вам і загадка: чалавек як быццам памагаў партызанам, хаваў на сваёй кватэры падпольшчыкаў, і яны ж нібыта вынеслі яму смяротны прысуд. Пра мёртвага Савіча не ўспаміналі, пакуль ніхто не ведаў, што ўжо некалькі год у горадзе жыве яго дачка Зося, якая пасля канцэнтрацыйнага лагера ў Германіі вярнулася дадому, дзе была выслана на поўнач за бацькавы «грахі». Дзеля яе, спакутаванай і хворай жанчыны з такім нялёгкім лёсам, і распачалі журналіст Шыковіч і хірург Яраш актыўныя пошукі праўды пра старога прафесара Савіча.

Заўважым, што ў рамане ёсць яскравая прыкмета часу: гісторыя мясцовага антыфашысцкага падполля пераглядаецца ў дні, калі ўвесь народ абмяркоўвае праект новай Праграмы КПСС, наскрозь прасякнутай увагай да чалавека, клопатамі аб яго шчасці. Прыйшоў час, калі Зося Савіч можа спадзявацца, што абароняць і яе добрае імя, хоць і сама яна дакладна не ведала, кім жа быў у час акупацыі яе родны бацька. Яна мае права на справядлівыя адносіны да сябе, бо, рызыкуючы ўласным жыццём, будучы тады яшчэ юнай дзяўчынкай, даволі актыўна дапамагала падпольшчыкам.

Вось той сюжэтны каркас, на якім трымаецца раман.

Нават з гэтага беглага пераказу відаць, якая складаная і адказная была задача пісьменніка: паказаць, як у нашы дні, у сувязі з ліквідацыяй шкодных вынікаў культу асобы, аднаўляецца вышэйшая справядлівасць у адносінах да кожнага чалавека, выкараняюцца перастрахоўка, парушэнні рэвалюцыйнай законнасці, зачыняюцца дзверы перад кар'ерыстамі і дэмагогамі.

Пісьменніку ўдалося многае. У рамане развенчана думка, якой на пачатку прытрымліваўся і хірург Яраш (дарэчы, адзін з падпольшчыкаў, уратаваных некалі Зосяй Савіч не без дапамогі старога прафесара), што няма патрэбы праз столькі год пасля вайны «варушыць мёртвых». Прыйшоў да правільнага разумення ён не адразу, але цяпер ужо цвёрда ведае, што гісторыя, калі яна разглядаецца з ленінскіх пазіцый, абавязкова спрыяе правільнаму выхаванню сучаснага пакалення людзей.

Кранае шчырасць Яраша, яго чалавечнасць, якую адчуваеш і пры яго нечаканай сустрэчы з Зосяй, і тады, калі ён бярэ на сябе адказнасць за хірургічную аперацыю на сэрцы, каб выратаваць жанчыну ад смерці. Твору нездарма дадзена назва: «Сэрца на далоні». Справа не толькі ў тым, што ў час аперацыі хірург трымаў на сваёй далоні жывое чалавечае сэрца. Яраш зрабіў значна больш: ён вярнуў жанчыне не толькі здароўе, але і веру ў сябе, у людзей, глыбокую ўпэўненасць, што і да яе абавязкова прыйдзе чалавечае шчасце, такое жаданае і такое заслужанае.

Мы не раз сустракаемся з Ярашам у тыя хвіліны, калі ён выратоўвае людзей ад смерці, вяртае ім здароўе, сілы, прагу да жыцця. Хораша раскрываецца гэтая багатая натура, калі Яраш думае аб сабе, аб асаблівасцях нашага часу. Былы падпольшчык-антыфашыст, адзін з тых гераічных удзельнікаў вайны, якія дзесяткі разоў сустракаліся са смерцю, доктар ведае, якія невычэрпныя магчымасці тоіць у сабе чалавек, калі ён служыць вялікай ідэі. Яраш не з тых людзей, што раскрываюць сваю душу перад кожным сустрэчным. Нават Шыковіч, з якім ён па-сяброўску сустракаецца ледзь не кожны дзень, не заўсёды разумее дружбака і даволі часта мяркуе, што, акрамя чыстай навукі, доктар мала чым цікавіцца. А той, хоць і не афішыруе гэта, блізка прымае да сэрца ўсё, што робіцца навакол.

Сустрэча з Зосяй Савіч праз многа гадоў пасля вайны мела важнае значэнне і для самога хірурга і для многіх іншых герояў рамана, асабліва для Шыковіча.

Адным з цікавейшых раздзелаў рамана з'яўляецца расказ Яраша аб тым, як пазнаёміўся ён у час вайны з маладзенькай Зосяй Савіч, якую клапатлівы бацька ўсяляк аберагаў ад палітыкі, ад нягод акупацыйнага рэжыму. Рамантычныя парыванні дзяўчыны даўно шукалі выйсця, але што і як рабіць, дзяўчына не ведала: бацька і пры акупантах працуе ў сваёй бальніцы, у доме Савічаў кватаруе гітлеравец, сама Зося ні з кім, акрамя гэтых двух людзей, не сустракаецца. А тут аднекуль урываецца малады чалавек, за якім гоняцца гестапаўцы і паліцаі. Яраш, які толькі што забіў здрадніка, не меў ніякага іншага выбару, як прызнацца Зосі і прасіць яе дапамогі, хоць ён ведаў, што стары Савіч працуе ў бальніцы і карыстаецца даверам акупантаў. Былі пры гэтым і надзея, што прафесар, мабыць, і не зусім прадаўся ворагу, і вера ў шчырасць дзяўчынкі, якая неяк вельмі непасрэдна і разумна паставілася да нечаканай сустрэчы.

Звярніце ўвагу: ідзе вайна, у захопленым акупантамі горадзе не спыняецца барацьба савецкіх патрыётаў з ворагам, а Зося корміць трусікаў, гатуе абеды для бацькі і кватаранта-фашыста. І ўсё ж яна адразу згаджаецца стаць побач з падпольшчыкам Ярашам і рабіць усё, што ёй будзе загадана. Няцяжка зразумець, што ўнутрана, душэўна, хоць і не да канца ўсвядомлена, Зося была гатова да барацьбы. Сустрэча з Ярашам стала свайго роду каталізатарам і паскорыла, прыспешыла імкненне да змагання: Аўтар добра разумее сваю гераіню, і не навязвае ёй гатовых рашэнняў. У галаве дзяўчыны яшчэ вельмі многа няпэўнага, па-дзіцячаму наіўнага. Яна балюча перажывае, калі даведваецца, што акупанты павесілі адзінаццаць савецкіх патрыётаў. Але пра тое, што нашы савецкія людзі забілі начальніка паліцыі, яна таксама гаворыць са смуткам. Не адразу раскусіла яна і кватаранта: «Грот добры чалавек. Культурны, ветлівы». А Яраш тым часам прыглядаецца да дзяўчыны, успамінае, як хітра яна ашукала гестапаўцаў, што па яго слядах уварваліся ў дом. «Якая была б падпольшчыца».—думае Яраш. Ён тады не ведаў, што крыху пазней Зосі давядзецца выканаць не адно адказнае заданне падполля.

Пройдзе нямала год, і Зося, ачуняўшы пасля аперацыі, раскажа Ярашу і Шыковічу пра сябе, пра свайго бацьку, пра тое, як яны дапамагалі савецкім разведчыкам, хавалі ў сваёй кватэры падпольшчыка Гукана. Зося ў час вайны прайшла суровую школу. Наіўнае дзяўчо вырасла ў змагара. Пасля вайны яна праз Гукана і іншых перастрахоўшчыкаў нямала папакутавала за нікім не даказаную віну бацькі. І вось цяпер, пасля ўсіх выпрабаванняў, жанчына з'яўляецца перад намі як чалавек, якога трэба ратаваць не толькі ад фізічных пакут, але і ад нявер'я ў сябе, у людзей. Шыковіч і Яраш, кожны па-свойму, памагаюць Зосі.

Тое, што робяць добрыя людзі для Зосі Савіч, мае прынцыповае значэнне і для філасофскай канцэпцыі твора, і для яго сюжэта. Фактычна ўсё, чым заняты героі рамана, так ці інакш звязана з рэабілітацыяй прафесара і яго дачкі: Шыковіч капаецца ў архівах, каб давесці, што Зосін бацька быў сумленным чалавекам; Яраш рыхтуецца да хірургічнай аперацыі і блискуча спраўляецца з ёю; празмерна раўнівая жонка Яраша страціла душэўную раўнавагу, мяркуючы, што на гарызонце паявілася яшчэ адна суперніца; старшыня гарвыканкома Гукан усімі даступнымі яму сродкамі перашкаджае рэабілітацыі зганьбаваных ім у свой час падпольшчыкаў. Сюжэтна ўсе героі рамана ўзаемазвязаны. І шкада, што гэтая ўзаемаабумоўленасць часам не з'яўляецца арганічнай і дасягаецца за кошт знешніх прыёмаў белетрыстыкі. Вонкавы сюжэт не заўсёды зліваецца з сюжэтам унутраным.

[Заканчэнне на 2 стар.].

НЕ ЗАБУДЗЕМ МЫ — не забудуць НАШЧАДКІ

НАШ ГОСЦЬ — «КЛУБ БАЯВОЙ СЛАВЫ»

Гэтымі днямі ў рэдакцыі адбылася размова на тэму, якая абмяркоўваецца на старонках «Літаратуры і мастацтва» ў матэрыялах пад рубрыкай «Не забудзем мы — не забудуць нашчадкі». Нагадаем нашым чытачам — размова пачалася ў верасні 1963 года артыкулам Героя Савецкага Саюза Уладзіміра Лабанка. Праслаўлены партызанскі камандзір гаварыў аб выхаванні моладзі на гераічных традыцыях, аб святым ушанаванні памяці загінуўшых герояў вайны, заклікаў грамадзянасць захаваць кожнае імя, кожны факт, які варты ўвайсці ў гісторыю нашага народа.

Пісьменнікі, настаўнікі, журналісты, вучоныя, партыйныя работнікі ў наступных матэрыялах, змешчаных на старонках газеты, падтрымалі думкі тав. Лабанка і адзначылі, што размова, якая пачалася на старонках газеты «Літаратура і мастацтва» павінна зацікавіць кожнага, хто глыбока шануе здабыткі і славу нашага народа ў дні рэвалюцыі, вайны, у дні гераічных нашых працоўных будняў.

Што скажуць людзі, якія самі прайшлі праз усе этапы незабыўных падзей, жыццё і справы якіх таксама з'яўляюцца старонкамі гераічнага летапісу? І вось—у нас у гасцях члены «Клуба баявой славы».

Васіль Сямёнавіч Пыжыкаў, член партыі з 1917 года. Ён часта выступае на маладзёжных вечарах, на ўрачыстых сходах. І калі гэты нешматслоўны, сціплы чалавек узнімаецца на трыбуну, у памяці і ва ўяўленні людзей ажываюць гады рэвалюцыйнай барацьбы, бальшавіцкага падполля, грамадзянскай вайны... Ваенны хірург Іосіф Анісімавіч Кажанкоў, адзін з тых, каму ў свой час выпала найвялікшае шчасце бачыць і чуць вялікага Леніна... Марыя Барысаўна Осіпава, слаўная падпольшчыца-партызанка, Герой Савецкага Саюза... Вядомыя арганізатары падполля і партызанскай барацьбы на Беларусі ў часы акупацыі Герой Савецкага Саюза Раман Навумавіч Мачульскі, Іван Дзмітравіч Вятроў, Яўген Мікалаевіч Канаплін... Рэдактар падпольнай «Звязды» Ядвіга Міхайлаўна Савіцкая.

— Мы падтрымліваем таварышаў, якія ўжо сказалі сваё слова ў газеце. Традыцыі гераічнага мінулага — залаты фонд выхавання, наша духоўнае багацце. На жаль, не заўсёды яшчэ мы выкарыстоўваем гэтае багацце ўмела і дзейсна. Многае, што складае наш гонар і з'яўляецца вялікай каштоўнасцю для гісторыі, ляжыць яшчэ некранутым. Многія імёны і факты, падзеі застаюцца невядомымі людзям, — гаварылі нашы госці.

Што трэба зрабіць грамадскасці ў гэтым напрамку? Праўленне «Клуба баявой славы» вырашыла ў бліжэйшы час разам з рэдакцыяй газеты «Літаратура і мастацтва» правесці шырокую канферэнцыю свайго актыву, паставіць і абмеркаваць на ёй пытанні, аб якіх ішла размова ў артыкулах пад рубрыкай «Не забудзем мы — не забудуць нашчадкі».

— Хацелася б, каб у рабоце нашай канферэнцыі прынялі шырокі ўдзел пісьменнікі і журналісты, — сказаў Яўген Мікалаевіч Канаплін. — Думаецца, што ўсе мы, хто непасрэдна ўдзельнічаў у падзеях, якія знаходзяць цяпер такое шырокае адлюстраванне ў мастацкіх творах, можам многае падказаць і параіць людзям пяра. Дарэчы, даўно варта наладзіць больш цесную творчую сувязь паміж намі.

У «Клуб баявой славы» ўваходзяць вядомыя ў народзе людзі, заслужаныя ветэраны рэвалюцыі, Айчыннай вайны, ветэраны працы. Аб тым, як працуе клуб, з якім сапраўды нязгасным энтузіязмам удзельнічаюць нашы паважаныя ветэраны ў выхаваўчай рабоце, як горача і зацікаўлена вядуць яны размову з моладдзю, расказаў старшыня клуба Раман Навумавіч Мачульскі.

— Таварышам іншы раз даводзіцца ў адзін дзень па два-тры разы выступаць перад моладдзю з успамінамі. І як сустракаюць іх у школах, саўгасных клубах, дамах культуры! Асабліва ў школах. Гарачыя, зацікаўленыя вочы дзяцей, іх бясконцая ўвага бадай лёш за ўсё сведчаць: сапраўды, гэта вялікая сіла — выхаванне на гераічных традыцыях! Мы павінны яшчэ многае зрабіць, каб гэтая сіла была заўсёды актыўнай і дзейснай. І ні ў якім разе нельга дапускаць таніх вось, напрыклад, рэчаў. Сёлета ўстанавілі ў Заслаўі на месцы пахавання загінуўшых партызан помнік. І толькі перад гэтай падзеяй прывялі ў парадак магілы. Няўжо для гэтага спатрэбілася дваццаць гадоў? Абыякавасць да памяці загінуўшых глыбока крыўдзіць і абурае, тым больш, што гэткія факты, на жаль, маюць месца не толькі ў Заслаўі.

— Мы павінны глыбока паважаць тых, хто ішоў на подзвігі ў імя Радзімы, — падтрымаў Іван Дзмітравіч Вятроў. — Наша маладое пакаленне павінна добра ведаць пра масавы гераізм савецкіх людзей у гады Айчыннай вайны. На жаль, мала мы расказваем і пішам яшчэ пра многія і многія, вартыя шырокай вядомасці подзвігі. Затое здараецца іншы раз, што ў мясцовы друк, я маю на ўвазе раённыя і абласныя газеты, трапляюць выдуманыя, неправераныя матэрыялы аб справах ваенных дзён. Гэта абражае пачуцці людзей.

Як больш поўна і ярка расказаць сучаснікам і нашчадкам пра масавы гераізм савецкіх людзей у дні вайны? — вось пытанне, якое найбольш хвалявала ўдзельнікаў размовы ў рэдакцыі. У кожнага знайшліся цікавыя прыклады, успомніліся яркія факты...

— Наша партызанскае злучэнне, — сказаў Савелій Герасімавіч Сідарэнка, — мела нямала сапраўдных герояў. І ў кожным подзвігу героя, за кожным імем цэлая гераічная паэма. Паэма, пакуль што яшчэ ненапісаная, нерасказаная як след.

— Удзельнікам незабыўных падзей у жыцці нашага народа ёсць аб чым расказаць. Трэба толькі, каб іх слова — і вуснае і друкаванае — заўсёды знаходзіла дарогу да людзей, — выказала сваю думку тав. Савіцкая.

Гэтыя і многія іншыя пытанні, якія хвалююць членаў «Клуба баявой славы» і, трэба спадзявацца, усю нашу грамадскасць, з'явяцца тэмай далейшай размовы.

Злева направа: І. А. Кажанкоў, С. Х. Левіна, Я. М. Канаплін, М. Б. Осіпава, Я. М. Савіцкая, Р. Н. Мачульскі, С. Г. Сідарэнка, І. Д. Вятроў, Ала Пашкевіч (інструктар Мінскага абкома камсамола), В. С. Пыжыкаў.

У ДАРОЗЕ ДА ЛЮДСКІХ СЭРЦАЎ

НЕБЫВАЛЫ ўздым творчай энергіі шырокіх мас яскрава праяўляецца і ў бурным развіцці мастацкай самадзейнасці. У ёй не толькі выяўляюцца самабытныя таленты, але вельмі хутка нараджаецца і моцна гучыць паэтычны водгук народа і на важнейшыя падзеі сучаснасці і на канкрэтныя факты жыцця свайго горада, завода, калгаса, вёскі.

Развіццё мастацкай самадзейнасці ідзе ў заўсёдных пошуках найбольш дасканалых і зручных форм праяўлення народных талентаў і ўздзеяння мастацтва на масы: ад невялікіх харавых калектываў і танцавальных гурткоў да народных оперных і драматычных тэатраў, ансамбляў песні і танца.

Адной з форм мастацкай самадзейнасці, якая набывае ў наш час усё большае пашырэнне, з'яўляюцца мастацкія агітбрыгады. Сваёй баявітасцю, актыўным умяшаннем у жыццё яны заваявалі ўсеагульнае прызнанне.

Мастацкая агітбрыгада— не новая з'ява ў нашым мастацтве. Агітбрыгады прафесіянальных і самадзейных артыстаў маюць багаты вопыт, выпрацавалі пэўныя творчыя традыцыі, якія выкарыстоўваюцца і сёння, але пошукі новага не спыніліся. Наадварот, цяпер яны сталі больш актыўнымі.

Параўноўваючы вынікі першага рэспубліканскага агляду агітбрыгад, праведзенага ў канцы 1961 г., і абласных аглядаў мастацкіх агітбрыгад, сельскіх клубаў і дамоў культуры, якія прайшлі ў канцы 1963 года, можна гаварыць аб значных поспехах у іх дзейнасці. Гледачы ўбачылі многа здольных калектываў, якія паказалі ўдалыя, палітычна спелыя і дасканалыя ў мастацкіх адносінах кампазіцыі. Змястоўнымі былі, напрыклад, праграмы агітбрыгады Рагачоўскага Дома культуры, якая выступала з літаратурна-мастацкай кампазіцыяй «Прывітанне з касмічных прастораў», агітбрыгады Стаўбцоўскага раённага Дома культуры з яе «Вожыкам у калгасе».

Поспеху лепшых мастацкіх агітбрыгад садзейнічае высокі ўзровень майстэрства выканаўцаў, добры рэпертуар, удалая рэжысура. Творчыя групы выкарыстоўваюць вершы, песні, мелодыі нашых паэтаў і кампазітараў, лепшыя здабыткі беларускага фальклору, пішуць уласныя творы на аснове мясцовых фактаў, шукаюць і знаходзяць цікавыя рэжысёрскія вырашэнні.

Аднак не заўсёды выступленні агітбрыгад вызначаюцца добрым мастацкім узроўнем. Калі знаёмішся з тэкстамі многіх кампазіцый (а стварыць уласную кампазіцыю або тэатралізаваны агляд імкнецца амаль кожная брыгада), адчуваецца, якую вялікую дапамогу трэба аказваць гэтым калектывам, каб іх выступленні былі па-сапраўднаму вострыя і трапныя. Часта бывае так, што кампазіцыі ствараюцца з самых разнастайных матэрыялаў, якія выпадкова трапляюць пад руку. Адсутнасць мастацкага густу і патрабавальнасці часам прыводзіць да таго, што ў тэатралізаваных аглядах бывае многа прымітыўных саматужных вершаў і частушак.

У сувязі з гэтым хочацца выказаць некаторыя меркаванні адносна формы выступленняў агітбрыгад і іх рэпертуару.

Большасць выступленняў агіткалектываў пабудавана як тэматычная літаратурна-мастацкая кампазіцыя або тэатралізаваны агляд. Такая пабудова дае магчымасць сканцэнтраваць увагу гледача і слухача на найбольш важных, цікавых і вострых пытаннях, усе творчыя намаганні накіраваць на дасягненне пэўнай мэты, пазбегнуць распыленасці і неакрэсленасці. Тое, што выступленні агітбрыгад набылі нейкую адносна ўстойлівую форму, форму тэматычнай літаратурна-мастацкай кампазіцыі, з'яўляецца ўвогуле станоўчым фактам. Але вядома, што далёка не кожны агіткалектыў мае дастаткова ўласных сіл, каб удала напісаць і добра паставіць такую кампазіцыю, не кожная агітбрыгада можа разлічваць на тое, што ёй напішуць кампазіцыю паэты і кампазітары або супрацоўнікі дамоў народнай творчасці. Ды нават і атрымаўшы гатовую кампазіцыю або склаўшы ўласную, не так лёгка яе паставіць, спаяць у адзінае арганічнае цэлае літаратурны, музычны, драматычны і харэаграфічны матэрыял, даць адпаведную нагрузку ўсім удзельнікам выступленняў, каб пазбегнуць такога становішча, калі працуюць на сцэне толькі два вядучыя ды баяніст, а астатнія — удзельнікі хору, на долю якога за ўвесь канцэрт прыпадае дзве-тры песні.

У свой час Рэспубліканскі Дом народнай творчасці падрыхтаваў і разаслаў метадычныя матэрыялы ў дапамогу мастацкім агітбрыгадам, у якіх раіў агітбрыгадам пачынаць сваю дзейнасць з такіх найбольш простых форм, як тэматычныя канцэрты, пабудаваныя на цікавым мясцовым матэрыяле. Паступова ўдасканальваючы сваё майстэрства, набываючы вопыт і аб'ядноўваючы вакол сябе творчыя сілы, агітбрыгады здолеюць у далейшым ствараць тэатралізаваныя канцэрты і літаратурна-мастацкія кампазіцыі або праграмы-агляды. На жаль, у некаторых калектывах не прыслухаліся да гэтай карыснай парады, не зразумелі, што лепш даць добры тэматычны канцэрт, чым слабую літаратурна-мастацкую кампазіцыю.

Рэпертуар агітбрыгады павінен адрознівацца ад рэпертуару звычайнага калектыву мастацкай самадзейнасці насычанасцю мясцовым матэрыялам, мэтанакіраванасцю, наяўнасцю сатыры. Вялікая роля ў стварэнні рэпертуару агітбрыгад належыць творчым групам, у якія ўваходзяць удзельнікі мастацкай самадзейнасці, настаўнікі, супрацоўнікі рэдакцый газет, аматары мастацтва. Якраз намаганнямі гэтых груп і ўзбагачаецца рэпертуар творамі на мясцовую тэматыку. Аднак пакуль што творчыя групы не атрымліваюць дастаткова дапамогі ні з боку дамоў народнай творчасці, ні з боку нашых творчых саюзаў і працуюць амаль што саматугам. Семінары самадзейных паэтаў і кампазітараў, якія збіраюцца ў Мінску і абласцях, далёка не ахопліваюць усіх тых, хто так або інакш удзельнічае ў стварэнні рэпертуару агітбрыгад.

Амаль у кожным выступленні мастацкіх агіткалектываў гучаць песні самадзейных паэтаў і кампазітараў. Гэта вельмі добра. За апошні час імі складзена нямала песень аб розных гарадах, раёнах, вёсках нашай Беларусі, у якіх аўтары імкнуліся выказаць пачуцці любві да сваёй радзімы, гонар за поспехі сваіх землякоў, за тое, што і іх горад, раён, вёска ідуць у адзіным страі з усёй нашай краінай па шляху да светлага будучага чалавецтва — да камунізма. Вядомыя «Рэчыцкая лірычная», песні аб Гомелі, Нясвіжы, Слоніме, Чачэрску, Брагіне і іншыя. Амаль усе яны ўключаюцца ў рэпертуар мастацкіх агітбрыгад. На жаль, такіх песень у нас вельмі мала і не ўсё з напісанага зроблена дасканала і ў літаратурных і ў музычных адносінах. І вось, калі чытаеш, з якім замілаваннем і натхненнем пішуць нашы паэты ў кнізе «Пяцьдзесят натыры дарогі» аб сваіх родных мясцінах, міжволі прыходзіць думка: якую добрую справу яны зрабілі б, пераклаўшы на мову паэзіі, верша-песні свае пачуцці любві да гэтых месц і гонару за іх сённяшні ўзлёт, за людзей, якімі славіцца край. Такі твор быў бы добрым падарункам сваім землякам. Можна спадзявацца, што гэту справу падтрымалі б і кампазітары.

Вельмі добра, што Рэспубліканскі Дом народнай творчасці, нарэшце, правёў семінар пісьменнікаў, якіх працуюць для самадзейнасці. Мастацкім агітбрыгадам сёння асабліва патрэбны творы, якія б з'явіліся дзейснай зброяй у барацьбе з перажыткамі мінулага ў свядомасці і быце, з іх носьбітамі і абаронцамі. Асабліва патрэбны вострыя антырэлігійныя творы, якія б выкрывалі ілжывасць і шкоднасць рэлігійнага вучэння.

Хочацца звярнуць увагу і на тое, што ў рабоце самадзейнасці ўвогуле і агітбрыгад у прыватнасці далёка не поўнасцю выкарыстоўваюцца наяўныя творчыя здабыткі. Вось адзін з прыкладаў. Агітбрыгада Лоеўскага РДК выступала з тэматычным канцэртам «Рэлігія — опіум для народа», у якім было нямала антырэлігійных твораў, асабліва частушак. Выступленне пакінула добрае ўражанне, але разам з тым засталася і незадаволенасць. Незадаволенасць не толькі тым, што асобныя творы трапілі міма цэлі, але і тым, што не былі выкарыстаны антырэлігійныя творы Ф. Багушэвіча, Я. Коласа, К. Крапівы, багатая вусна-паэтычная спадчына, лепшыя ўзоры якой сабраны ў кнізе «Антырэлігійныя казкі, частушкі, прыказкі».

Чаму так здараецца? Чаму ў рэпертуары нашых агітбрыгад не знайшлі месца многія выдатныя творы нашай літаратуры, музыкі, драматургіі, вусна-паэтычнай творчасці? Гэта здараецца, відаць, таму, што Рэспубліканскі і абласныя дамы народнай творчасці не знайшлі яшчэ шляхоў аператыўнай дапамогі мастацкім агітбрыгадам, дапамогі, якая б падтрымлівала і развівала ініцыятыву знізу. Зразумела, добра было б рэгулярна выдаваць рэпертуарныя зборнікі ў дапамогу агітбрыгадам, але гэта не адзіны і не самы надзейны спосаб дапамогі. Не менш карысна і ў той жа час значна прасцей рэгулярна выдаваць метадычныя лісткі для агітбрыгад. У такіх лістках побач з метадычнымі парадамі можна было б даваць рэкамендацыйныя спісы літаратуры, мастацкай і музычнай, якую можна выкарыстаць у тым ці іншым тэматычным канцэрце. Такія рэкамендацыйныя, добра анатаваныя спісы памогуць скараціць выдаткі на перадрукаванне ўжо вядомых мастацкіх твораў, дадуць магчымасць шырокага выбару, дапамогуць зрабіць выступленні больш змястоўнымі і разнастайнымі.

Для актыўнай дапамогі мастацкім агітбрыгадам можна было б шырэй выкарыстаць часопіс «Маладосць» і яго дадатак «А гармонік грае, грае...», які хоць і прызначаны для мастацкай самадзейнасці, але рэдка змяшчае матэрыялы спецыяльна для агітбрыгад.

Выказваючы некаторыя заўвагі аб рабоце мастацкіх агітбрыгад, я хацеў бы падкрэсліць іх вялікую ролю ў камуністычным выхаванні працоўных, у фарміраванні матэрыялістычнага светапогляду, эстэтычных густаў. І таму, зразумела, трэба зрабіць усё магчымае, каб іх праца давала яшчэ большую карысць.

К. КАБАШНІКАЎ,
кандыдат філалагічных навук.

ЛЕПШЫ ПАРК РЭСПУБЛІКІ

Падведзены вынікі грамадскага агляду паркаў, які праводзіўся па рашэнню Савета Міністраў БССР і Беларускага рэспубліканскага савета прафсаюзаў. Пераможцам агляду прызнаны Гомельскі гарадскі парк імя Луначарскага. Яму прысвоена ганаровае званне «Лепшы парк культуры і адпачынку рэспублікі» і прысуджан дыплом першай ступені.

Летась у гарадскім парку праведзена 45 тэматычных вечароў, 35 калектыўных дзён адпачынку для рабочых і служачых прадпрыемстваў, прачытана 130 лекцый і дакладаў. Каля 300 тысяч чалавек пабывала толькі на лекцыях па літаратуры і мастацтву.

На адкрытай эстрадзе парку выступалі многія прафесіянальныя і самадзейныя калектывы. Канцэрты тут давалі артысты Беларускай дзяржаўнай філармоніі, Дзяржаўнага народнага аркестра БССР, народны тэатр і ансамбль Палаца культуры імя Ул. І. Леніна, мастацкія калектывы прадпрыемстваў і раённых дамоў культуры.

АГЛЯД НАРОДНЫХ ТЭАТРАЎ

У Пінску адбыўся агляд народных тэатраў і драматычных калектываў Брэсцкай вобласці, прысвечаны 45-годдзю БССР.

У аглядзе прынялі ўдзел сем самадзейных труп. Лепшымі прызнаны Пінскі народны тэатр гарадскога Дома культуры, Баранавіцкі народны тэатр і Брэсцкі народны тэатр клуба чыгуначнікаў.

Пінскі народны тэатр паказаў на аглядзе п'есу А. Маўзона «Пад адным небам», у праграме народнага тэатра Баранавіцкага Дома культуры была п'еса І. Вінніка «Ільюшка смяецца», Брэсцкі народны тэатр паставіў «Дзяўчыну з вяснушкамі» А. Успенскага.

Пераможцам агляду ўручаны прызы і дыпломы ўпраўлення культуры Брэсцкага прамысловага аблвыканкома.

Ф. БАРЫСАВА.

З РЭСПУБЛІКАНСКАЙ МАСТАЦКАЙ ВЫСТАВКІ.
У. САДЗІН. Дарога на калійны камбінат (лінагравюра)

ДОБРЫ ЭСКІЗ

У Маскве, на Арбаце, у старым доме жывуць са сваімі мужамі тры сястры. Вось яны і складаюць «каманду карабля», якую адправіў у плаванне па жыццю драматург Юліу Эдліс у сваёй п'есе «Арганаўты». Праўда, у адрозненне ад герояў старажытнай легенды пра арганаўтаў большасць герояў п'есы імкнецца здабыць не казачнае залатое руно, а чалавечае шчасце, і не толькі для сябе, але і для навакольных.

П'еса «Арганаўты» не пазбаўлена недахопаў, не ўсе вузлы ў ёй развязваюцца, не ўсе «ружжы страляюць». Залішне навязчывыя літаратурныя асацыяцыі,—аўтар яўна помніў аб існаванні чэхаўскіх трох сясцёр.

Але ў перайманні добрых традыцый, напрыклад, чэхаўскіх, заключаюцца і добрыя бакі п'есы: драматург імкнецца паказаць унутраны, скрыты бок падзей, унутраны драматызм чалавечага лёсу і адносін людзей. Спачатку здаецца, што ў п'есе ўзнікаюць канфлікты чыста ўнутрысямейныя. Але далейшае разгортванне падзей паказвае, што канфлікты перарастаюць сямейна-бытавыя рамкі, і разыходжанне паміж людзьмі ўзнікае па пытаннях куды больш шырокіх і значных, чым нормы паводзін у хатнім быце. У п'есе вырашаецца адна з асноўных маральных праблем нашай рэчаіснасці: праца павінна быць крыніцай творчай радасці, а не адным са сродкаў існавання.

Мне здаецца, што з'яўленне гэтай п'есы на афішы Брэсцкага тэатра—невыпадковае. Ёсць нейкая духоўная блізкасць паміж сцэнічнымі біяграфіямі «Арганаўтаў» і жыццёвым лёсам ветэранаў Брэсцкага тэатра.

Тэатру сёлета споўніцца 20 гадоў. У свой час яго ядро склалі выпускнікі Маскоўскага гарадскога тэатральнага вучылішча. У Брэсце мацнела іх сцэнічнае майстэрства. Некаторыя, як пастаноўчык «Арганаўтаў» Г. Волкаў, сталі заслужанымі артыстамі рэспублікі. Гэтыя «біяграфічныя» абставіны, відаць, вельмі дапамаглі таму, што так перакананўча, напрыклад, вырашаецца ў спектаклі праблема развітання некаторых персанажаў з Масквой. А адзін з іх, абывацель і мешчанін, думае проста: пакідаюць Арбат і Маскву добраахвотна толькі ў спектаклях і ў кіно, ён не разумее, як гэта можа Гога паехаць у Чыту нават у імя цікавай, самастойнай работы.

Форма спектакля — даволі традыцыйная, выпрабаваная. Перад пачаткам кожнага акта раскрываецца заслона, а пасля заканчэння — закрываецца, і ніхто не ходзіць праз глядзельную залу. Няма асаблівых знешніх эфектаў. Затое ёсць імкненне і ўменне рэжысёра дапамагчы акцёрам ува собіць складанасць і тонкасць духоўнага жыцця персанажаў. Дзякуючы рэжысуры Г. Волкава, «карабель арганаўтаў» атрымлівае глыбокую асадку — ён быццам айсберг, толькі частка яго нам бачна, а ўсё астатняе адчуваецца; усе намаганні рэжысуры накіраваны на тое, каб выявіць унутранае жыццё герояў, працэс іх думак і пачуццяў. Спектакль сучасны не знешне, а ўнутрана, ён вабіць сваёй інтэлектуальнай насычанасцю.

Аўтар назваў п'есу «лірычнымі сцэнамі». У ёй шмат камічных неадпаведнасцей. Яны выяўляюцца паміж знешняй бачнасцю падзей, сітуацый, характараў і іх унутраным зместам. Такім чынам, у рэжысёра былі падставы для таго, каб паставіць проста смешную камедыю, тым больш, што Г. Волкаў моцны ў гэтым жанры. Спектакль жа вырашаны як лірыка-псіхалагічная камедыя. З самага пачатку паміж сцэнай і глядзельнай залай устанаўліваецца атмасфера ўзаемнага разумення. Жыццёвыя асацыяцыі прымушаюць гледача параўноўваць сябе і людзей, якія іх акружаюць, з убачаным на сцэне. Жыва ўспрымаюцца трапныя афарызмы (дарэчы, імі насычана п'еса і яны гаворыць аб тым, што ад Юліу Эдліса можна чакаць многага).

Тэатр

Вельмі вялікую ролю ў спектаклі адыгрываюць паўзы—змястоўныя, напоўненыя.

«Аб чым маўчыце?»—пытаецца Гога.

«Аб жыцці», — адказвае Вадзім.

Вось такіх паўзаў «аб жыцці» ў спектаклі многа. Мінчане бачылі брэсцкіх «Арганаўтаў» па тэлебачанні. Звычайна пры паказе тэатральных спектакляў па тэлебачанні гранічна скарачаюцца паўзы, бо экранны час значна большы па працягласці, чым сцэнічны. Але ў «Арганаўтах» яны былі захаваны—да такой ступені яны насычаны і апраўданы.

Зразумела, усё сказанае ў адрас Г. Волкава як пастаноўшчыка адносіцца і да акцёраў, бо калі б рэжысёр не знайшоў з імі агульнай мовы, спектакль не атрымаўся б.

Задуму аўтара і рэжысёра вельмі дакладна даносіць заслужаны артыст БССР С. Яўдошанка ў ролі Гогі. Гэта чалавек, які не любіць пышных фраз, часта лічыць за лепшае гаварыць аб важным нібыта жартам. Лёгка ўступаючы па дробязях, Гога на праверку бескампрамісны, прынцыповы, паслядоўны ва ўсіх сваіх учынках.

Жонку Гогі Наташу іграе артыстка Р. Сёмічава. Спачатку Наташа—інфантыльная істота, якую ўсе ўсяму вучаць, але ў выніку яна бярэ верх над тымі, хто яе апякаў. Наташа Р. Сёмічавай успрымаецца як зусім канкрэтны чалавек з уласцівымі толькі яму звычкамі, гумарам, жыццёвай пазіцыяй.

Ніну (арт. Р. Ляцэвіч) называюць «старшынёй». І сапраўды, яна ўпэўненая, здольная прымусіць іншых падпарадкоўвацца сабе, прызнаная галава сям'і. Аднак вобраз Ніны атрымаўся статычны, артыстка не здолела па-сапраўднаму выявіць тую метамарфозу, якая адбылася з Нінай у далейшым, калі яе стаўленне да людзей і погляды на жыццё змяняюцца карэнным чынам.

Бясспрэчная ўдача спектакля—вобраз Стасіка (артыст М. Галдоўскі). Самы энергічны і «перспектыўны» чалавек у сям'і, першы ў ёй кандыдат навук, ён аказваецца на праверку няўстойлівым, нават блізкім да таго, каб стаць закончаным мешчанінам. Акцёру ўдалося шчасліва пазбегнуць многіх штампаў, якія існуюць у тэатры для выканання іменна такіх роляў. Ключом да вобраза Стасіка у М. Галдоўскага служыць сцэна, калі ён глыбока задумваецца, застаўшыся сам-насам са сваім зубаўрачэбным крэслам. Гэтая сцэна гаворыць аб многім. Стасіка пачынаюць мучыць сумненні адносна сваёй буйнай дзейнасці прыватнага ўрача. І зусім ніякавата робіцца Стасіку, калі ён бачыць, што яго жыццёвыя пазіцыі і пазіцыі яго пацыента, якога іграе артыст С. Юркевіч, падобныя.

Вопытным акцёрам Р. Барзовай і заслужанаму артысту БССР Ю. Уласаву (яны выконваюць ролі Ірыны і Вадзіма) даволі цяжка апраўдаць усе тыя абставіны, у якія іх ставіць аўтар. Акрамя таго, іх індывідуальнасці (не столькі тыпажнага, колькі ўнутранага парадку) не зусім адпавядаюць таму, што задумана аўтарам. Можа быць, таму і адбываецца трохі ненатуральна падкрэсленае выкананне задач, якія пастаўлены перад імі.

Спектакль «Арганаўты» гаворыць аб тым, што Брэсцкі тэатр здольны вырашаць складаныя сучасныя праблемы, якія хвалююць гледача, калі ён мае адпаведную драматургію. П'еса «Арганаўты» набліжаецца да таго, каб ажыццявіць падобную задачу. І хаця гэта пакуль эскіз да будучага глыбокага спектакля, аднак лепш добры эскіз, чым дрэнная карціна.

Дарэчы, мастак спектакля В. Мудрогін стварыў зручную сцэнічную пляцоўку. Тэатр абыходзіцца без частага павароту круга. Толькі шкада, што ў афармленні самой кватэры ў старым арбацкім доме падаецца сучасны інтэр'ер. Арбат, як нам вядома, па новаму плану рэканструкцыі Масквы будзе знесены. І хочацца верыць, што калі яго жыхары пераедуць у новы дом, Стасік не пацягне туды сваё зубаўрачэбнае крэсла. Людзі, якія яго акружаюць, не дазволяць яму гэта зрабіць. Ды проста немагчыма будзе прыбіць да дзвярэй новага дома прыватнаўласніцкую таблічку «Лячэнне, устаўленне і выдаленне зубоў».

Віктар КАРПІЛАЎ.

ЗОСЯ САВІЧ І ІНШЫЯ

[Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.].

Пачнём з вобраза Зосі. Пакуль яна была дзяўчынкай і рабіла першыя самастойныя крокі ў жыцці, аўтар уважліва сачыў за яе душэўным станам і заставаўся верным логіцы гэтага характару. Можна зразумець і незалежныя ад Зосі прычыны, якія змусілі яе пакарыцца свайму цяжкаму лёсу і ні на што не прэтэндаваць. Але ж потым, пасля XX з'езду КПСС, пасля шматлікіх сустрэч з добрымі і сумленнымі людзьмі, пасля таго, як жанчына акрыяла і фізічна, пасіўнасць яе ўжо нічым болей не апраўдана. Усё, здаецца, адноўлена Засталася не адноўленая толькі ранейшая актыўнасць пачуццяў. У Зосі няма асабістых планаў нават на самы бліжэйшы час. Пакахаўшы Яраша, яна ўцякае з роднага горада, каб зноў недзе адчуваць сябе адзінокай і абдзеленай жыццём. З гераіняй здарылася самае страшэннае для чалавека: у яе няма будучыні, няма актыўнага жадання змагацца за сваё шчасце. А гэта ж пярэчыць усяму, што мы ведалі раней пра Зосю, пра яе характар, яе ўнутраныя магчымасці. Такое нематываванае перараджэнне чалавечага характару магло спатрэбіцца пісьменніку хіба толькі для закруглення знешняга сюжэта: знікненне Зосі прынесла мір і заспакаенне ў сям'ю доктара Яраша, якому ўжо не трэба будзе чакаць ад жонкі дзікіх сцэн рэўнасці.

Навошта, далей, спатрэбілася, каб Яраш паўтарыў гісторыю біблейскага Іосіфа, якога хацела і не змагла спакусіць прыгажуня-егіпцянка? У ролі такой егіпцянкі выступае разбэшчаная ажно да паталогіі медычка Тамара Гаецкая, адзіная мэта якой — зрабіць Яраша сваім палюбоўнікам. Актыўнае супрацьўленне Яраша даводзіць жанчыну да шаленства, і яна помсціць нахабна, груба, не адмаўляецца ад плётак, правакацыйных ананімак. Разумны, сціплы, заўсёды вытрыманы і разважлівы доктар чамусьці ніяк не ўцяміць, што толькі адкрыты адпор мог бы паставіць на месца Тамару Гаецкую.

Але гэта не самыя галоўныя пункты, па якіх варта, на маю думку, паспрачацца з аўтарам. Большыя падставы для спрэчак дае трактоўка вобразаў пісьменніка Шыковіча і старшыні гарвыканкома Гукана. Мне здаецца, што ў дадзеным выпадку ўсё ішло добра да таго часу, пакуль аўтар заставаўся псіхолагам-аналітыкам і думаў не толькі пра пэўную праблему, але і пра жывых людзей, якія па-свойму ставяцца да гэтай праблемы і яе практычнага вырашэння.

Паміж старшынёй гарвыканкома Гуканам і пісьменнікам Шыковічам непазбежны востры канфлікт. Неўзабаве пасля вайны яны разам пісалі кнігу пра гарадское антыфашысцкае падполле: першы даваў факты, другі ўзяў на сябе іх літаратурную апрацоўку. З меркаваняў перастрахоўкі Гукан зганьбіў многіх падпольшчыкаў. Пасля XX з'езду КПСС Шыковіч пачаў здагадвацца, што, сам таго не разумеючы, ён дапамог фальсіфікатару. Перш за ўсё ў яго ўзнікла жаданне высветліць загадку прафесара Савіча... Як жа раскрываюцца ў гэтым канфлікце характары абодвух сааўтараў фальшывай кнігі?

Гукан, каб ён быў да канца сумленным чалавекам, мусіў бы прызнацца, што яшчэ ў час вайны не захацеў высветліць сапраўдную сутнасць прафесара, які ўратаваў яму жыццё, каб яго, Гукана, чаго добрага, не абвінавацілі ў сувязях з чалавекам, які афіцыйна лічыўся штатным работнікам акупацыйнай установы. Пасля ўсё з тых жа меркаванняў перастрахоўкі ён зганьбіў і самую памяць пра Савіча, дамогся высылкі яго дачкі. На словах Гукан асуджае культ асобы Сталіна і прызнае, што трэба аднавіць справядлівыя адносіны да ўсіх людзей, але што для яго мёртвы Савіч і яго жывая дачка, калі праўда пра іх падарве яго аўтарытэт? І Гукан актыўна перашкаджае Шыковічу ў пошуках праўды.

Гукан мужна ваяваў з ворагам, пасля вайны аддаў многа сіл аднаўленню горада, у грамадскасці няма падстаў не верыць такому чалавеку. Згодзімся з аўтарам, што ва ўмовах культу асобы Гукан мог праявіць слабасць і паставіцца несправядліва да некаторых людзей. Але дзе і калі пачаўся той пералом, пасля якога чалавек ужо не здольны выпраўляць свае памылкі і не мае за душою нічога святога, партыйнага? Мы зусім не хочам навязаць аўтару сваю трактоўку вобраза. Мы толькі хацелі б, каб аўтар матываваў тую дэградацыю, якая раздвоіла вобраз Гукана.

Культ культам, але ж чалавек мае рацыю, калі гаворыць пра сябе: «Я эвакуіраваў горад—не баяўся. Адступаў ад Масквы — не баяўся. Мяне паслалі назад у тыл — я не баяўся, не бегаў па камісіях, як другія. Ні разу не скакаў з парашутам—скочыў, у ноч, у балота, пад бокам у нямецкага гарнізона. Вадзіў людзей на аперацыі—не баяўся. Пайшоў у горад на сувязь, каб наладзіць разбітае падполле,—не баяўся». Гэта—адзін Гукан. А вось вам другі Гукан, які пасля XX з'езду КПСС шкадуе, што нельга аднавіць культаўскія парадкі: «Ох, распусцілі вас. Спахопіцеся!» Аўтар ухіліўся ад грунтоўнага, дакладнага псіхалагічнага аналізу прычын такой метамарфозы і не адказаў поўнасцю на законнае пытанне: чаму ў душы чалавека ўзялі верх палахлівасць, пагарда да людзей, а затым і нянавісць да іх («ён адчуў нечаканы прыліў нянавісці да іх—да Тарасава, да Шыковіча, да Кушнера, да Яраша, да гэтага маладога архітэктара—за тое, што яны такія—у нечым галоўным не такія, як ён»).

Шыковіч — антаганіст Гукана, чалавек прынцыповы і справядлівы. Калі ён міжволі садзейнічаў некалі стварэнню фальшывай кнігі аб падполлі, то цяпер без непатрэбнай амбіцыі гатовы прызнаць памылку і выправіць яе. І мы добра разумеем пісьменніка Шыковіча, калі ён з вялікім азартам сапраўднага даследчыка пераглядае архіўныя матэрыялы, шукае жывых сведак, каб высветліць і сказаць народу—кім жа быў прафесар Савіч—ворагам, рэнегатам ці высакародным савецкім патрыётам?

Але ў некаторых выпадках мы не зусім разумеем Шыковіча—як пісьменніка і як чалавека. Прывяду такі прыклад. Шыковіч не заўважыў, што сын адбіўся ад рук, стаў крытыканам і стылягам у самым горшым разуменні гэтых слоў. Славік Шыковіч недзе набраўся чужых думак і безразважна жангліраваў імі. З асалодай смакаваў ён розную лухту аб брыгадах камуністычнай працы, аб старэйшым пакаленні савецкіх людзей.

З тлумачэння, якое Шыковіч даў у гаркоме партыі, яскрава відаць, што ён так і не зразумеў, чаму сын вырас абібокам: «Як я выхоўваю сваіх дзяцей? Было б недарэчнасцю сказаць—абсалютна правільна, бо абсалютна правільнае выхаванне ў маім разуменні, само па сабе — абсалютнае глупства. Але я адно магу сказаць: у галоўным мы—я і жонка—ніколі не давалі дрэнных прыкладаў... Я быў дармаедам? Несумленным перад грамадствам, перад партыяй? Хітраваў? Браў хабары? Жыў не па сродках?... Усю вайну я быў на фронце. Пасля настаўнічаў. Жонка і цяпер настаўнічае... Скандалаў нашы дзеці не чулі. Калі спрачаемся, то па прынцыповых пытаннях. Між іншым, часцей за ўсё якраз пра гэтае самае выхаванне. Яна педагог і, думаю, нядрэнны. Але ў адносінах сваіх дзяцей робіць тую ж памылку, якую робяць многія маці ў інтэлігентных сем'ях. Аберагаюць ад фізічнай працы».

Мы ахвотна верым шчыраму прызнанню Шыковіча, што ён, нягледзячы на зацікаўленасць у правільным выхаванні дзяцей, не ведае, як гэта рабіць. Ён і сапраўды мог занадта позна заўважыць, што сын паддаўся дурным уплывам, набраўся чужых думак, ператварыўся ў эгаіста. Але пытанне, якое Шыковіч паставіў перад самім сабою, патрабуе адказу: чаму Славік, пры ўсіх сваіх добрых задатках і ўнутраных магчымасцях, пераймае самыя нездаровыя тэндэнцыі маральнага, душэўнага стыляжніцтва і з лёгкім сэрцам абражае таварышаў па заводу, насміхаецца з маладой работніцы, якая яго пакахала, прывучаецца да п'яных прыгод? Адказаць на гэтае пытанне павінен быў аўтар рамана, адказаць логікай самога вобраза малодшага Шыковіча, паказам тых акалічнасцей, якія спрылялі такому, а не інакшаму напрамку ў развіцці чалавечага характару Славіка.

«Сэрца на далоні»—цікавы раман. З рэальнага жыцця ўзята цэнтральная праблема — аднаўленне справядлівасці ва ўсім, што закранае жыццёвыя інтарэсы савецкага чалавека. Цікава і арыгінальна напісаны многія раздзелы, жыццёвыя, праўдзівыя многія вобразы. І ўсё ж, на маю думку, добра было б, каб, рыхтуючы «Сэрца на далоні» да выдання асобнай кнігай, пісьменнік яшчэ раз прайшоўся клапатлівай рукой па старонках рамана.

ВЫНІКІ МУЗЫЧНАГА ГОДА

Наколькі плённым і «ўраджайным» быў леташні год для беларускіх кампазітараў, што значнага стварылі яны ў розных жанрах музыкі—вось асноўная тэма размовы, якая адбылася нядаўна на агульным сходзе членаў кампазітарскай арганізацыі нашай рэспублікі.

У сваім дакладзе старшыня праўлення Саюза кампазітараў Д. Камінскі адзначыў, якое выключнае значэнне мае пастанова чэрвеньскага Пленума ЦК КПСС для далейшага паспяховага развіцця ўсёй савецкай, і ў тым ліку беларускай, музыкі. Яе творцы атрымалі ясную і дакладную праграму дзейнасці.

Кампазітары няблага папрацавалі ў мінулым годзе, яны стварылі рад новых, буйных музычных палотнаў. Сярод іх—Шостая сімфонія Я. Цікоцкага, Другая сімфонія Я. Глебава, Сёмая сімфонія М. Аладава, уверцюры Л. Абеліёвіча, Д. Смольскага і Р. Бутвілоўскага, віяланчэльны канцэрт А. Багатырова і другі скрыпічны канцэрт Д. Камінскага, кантаты — «Камуністы вядуць» Я. Глебава і «Гімн Радзіме і чалавеку-творцу» І. Кузняцова і іншыя. Некаторыя навінкі беларускай музыкі, у прыватнасці сімфанічнай, прагучалі ў гэтым сезоне з эстрады канцэртнай залы філармоніі, а іншыя—чакаюць свайго выканання.

Д. Камінскі, расказаўшы аб выніках творчай працы кампазітараў, спыніўся на рабоце музыказнаўчай секцыі, закрануў пытанні прапаганды музыкі. Ён заклікаў сваіх калег па мастацтву як мага лепш падрыхтавацца да маючага адбыцца вясной гэтага года пленума Саюза кампазітараў БССР па сімфанічна-камернаму жанру, а таксама да творчай справаздачы беларускіх аўтараў на сакратарыяце Саюза кампазітараў СССР.

Размову па выніках музычнага года працягвалі ў спрэчках Д. Лукас, Т. Дубкова, К. Сцепанцэвіч, Я. Цікоцкі, Р. Бутвілоўскі, Р. Шырма і іншыя. Яны падзяліліся сваімі думкамі пра некаторыя апошнія творы беларускай музыкі, выказалі меркаванні аб падрыхтоўцы новых кампазітарскіх кадраў і ролі Саюза кампазітараў у музычным жыцці рэспублікі.

Вось ён, самы ўдзячны слухач! Музыка гучыць у цэхах, і рабочыя Магілёўскага завода пад'ёмна-транспартнага абсталявання, да якіх прыехаў з канцэртам Беларускі народны аркестр, ад душы апладзіруюць артыстам.

У час гастроляў у Магілёве аркестр выступаў таксама ў цэхах завода «Строммашына», у палацах культуры завода штучнага валакна і швейнай фабрыкі імя Валадарскага. Рабочая аўдыторыя цёпла сустракала кожны нумар праграмы.

Артыст аркестра М. Рубінштэйн зрабіў гэты здымак у час выступлення на заводзе «Строммашына». За цымбаламі — саліст аркестра лаўрэат VI Сусветнага фестывалю моладзі В. Бурковіч.

ЧАСОПІСЫ ў студзені

Полымя Беларусь Маладосць

На пачатку года асабліва зразумелае слова **першае**. У прыватнасці, неўзабаве чытачы атрымаюць **першыя ў гэтым годзе** нумары нашых літаратурна-мастацкіх і грамадска-палітычных часопісаў. Што ж цікавага будзе на іх старонках?

Проза. Новы раман Івана Мележа «Навальніца над полем», які з'яўляецца працягам яго палескай хронікі, пачынае друкаваць «Полымя». Па два апавяданні змяшчаюць у першым нумары часопіса Янка Скрыган і Іван Навуменка. Зацікавіць, думаецца, чытачоў і новая дакументальная аповесць Івана Новікава «Дарогі скрыжаваліся ў Мінску» — аб барацьбе нашага народа супраць фашызму і тых цёмных сіл, якія ўсплылі напаверх з прыходам акупантаў на нашу зямлю — нацыяналістычных паслугачоў акупантаў. «Маладосць» змяшчае новую аповесць Васіля Быкава «Альпійская балада». Апавяданне Яўгена Васілёнка, урывак з аповесці Алеся Якімовіча, дзве навелы маладых кубінскіх пісьменнікаў, а таксама працяг аповесці Георгія Шыловіча друкуе «Беларусь».

Паэзія. Вялікім цыклам вершаў «Верасень» Петруся Броўкі адкрываецца «Полымя». Тут жа змешчаны верш Антона Бялевіча «21 студзеня 1924». Нізкі вершаў С. Хадаронка, В. Вярбы, К. Камейшы змешчаны ў «Маладосці», вершы К. Кірэенкі, Э. Агняцвет і С. Шушкевіча ў «Беларусі». 31 студзеня спаўняецца пяцьдзесят гадоў вядомаму перакладчыку беларускай паэзіі Якаву Хелемскаму. Часопісы змяшчаюць вялікія падборкі яго вершаў.

Нарысы, публіцыстыка, мастацтва. Яны таксама ёсць у студзеньскіх нумарах часопісаў. Артыкул В. Бурносава, прысвечаны 45-годдзю БССР, і артыкул М. Модэля аб Беларускім оперным тэатры друкуе «Полымя». Артыкулы Р. Сабаленкі і А. Шаўні, нарыс М. Сергіевіча, выступленне майстра Мінскага завода аўтаматычных ліній А. Філіча, запіскі А. Літвіна і А. Вольнага аб паездцы беларускага ансамбля танца на арабскі Усход, рэпартаж з будаўніцтва Баранавіцкага тэкстыльнага камбіната І. Кармалітавай змяшчае «Беларусь». Нарыс С. Кухарава аб людзях калгаса «Бальшавік» Свіслацкага раёна і запіскі студэнткі аддзялення журналістыкі БДУ імя Ул. І. Леніна Галіны Айзенштат прапануе чытачам «Маладосць».

Крытыка, літаратуразнаўства, бібліяграфія. Асабліва багаты гэтыя раздзел у «Полымі». Тут змешчаны артыкулы «Свет Купалы» Р. Бярозкіна, «Прысвячаецца радасці» М. Стральцова, «Вялікі паэт літоўскага народа» А. Зарыцкага, рэцэнзіі С. Грахоўскага на кнігу Я. Пушы «Пачатак легенды», В. Каваленкі на зборнік «Літаратура нашых дзён», А. Вярцінскага на кнігу А. Марціновіча «Водгулле», а таксама некалькі кароткіх рэцэнзій. У «Маладосці» чытач знойдзе артыкул Ул. Юрэвіча «Шматгалоссе жыцця» аб рамане Івана Мележа «Людзі на балоце», а ў «Беларусі» — рэцэнзіі на кнігі Ул. Дамашэвіча «Між двух агнёў», «Час і песні» Ул. Калесніка, «Мае людзі» Б. Паўлёнка і «Нагбом» Р. Барадуліна.

На гэтай старонцы змяшчаем сёння некаторыя з тых матэрыялаў, якія друкуюцца ў студзеньскіх нумарах «Полымя», «Маладосці» і «Беларусі».

Пятрусь БРОЎКА

З ЦЫКЛА «ВЕРАСЕНЬ»

Гулкія хвалі, колькі вас, розных, вецер сядлае і гоніць,
Вас табуны. Леціцё ў беспрыстанне, быццам грывастыя коні.
Вецер мацнее. Куды я ні гляну, вас усё болей і болей.
Кожная хоча дагнаць каб другую, ды не ўдаецца ніколі.
Бачу адну я: імчыцца навыскач і, не нагнаўшы, лютуе.
Тая ж, што выйшла раней у дарогу, бераг пясчаны цалуе.
Так і ў жыцці нашым часта бывае, хвалі — грывастыя коні:
Сэрца кагосьці дагнаць пажадае, толькі ніяк не дагоніць.
След той губляецца, нікне ў дарозе, потым схаваюць завеі,
Вашы ж размовы, бурныя, ціхія, нам пакідаюць надзеі.
Кожнаму здзейсніць свае пажаданні, будзь то увечар ці рана:
Старасці — роздуму, цішы, спакою; шчасця ў жыцці — закаханым!

* * *

Адышло ўжо дзён багата —
Што лістоў зляцела з гаю...
Камсамольцы год дваццатых,
Я радзей вас сустракаю.

Ведаю, што вам прыпала
Перажыць і вызнаць многа.
І не дзіва — вас нямала
Засталося на дарогах.

Без аркестраў вас хавалі,
Не ўсцілалі груд вянкамі,
Толькі сосны і спявалі
Развітальную над вамі.

Ды нас многа яшчэ службу
Скрозь нясе, як след, заўзята,
Мы мацуем нашу дружбу,
Як калісьці ў год дваццаты.

Хай бывае цяжка часам, —
Не здаюцца нашы сэрцы,
З тымі, хто ў жыцці застаўся,
Люба-дорага сустрэцца.

Хто з палёў, хто з гор, хто з мора,
Сабяромся і сядаем,
А настрой такі бадзёры —
Як і некалі, спяваем.

Хоць галовы пабялелі,
Ды глядзім наперад смела.
Час прыйшоў. Мы пастарэлі.
А зямля памаладзела.

* * *

Мой верасень!
Ты развітаўся МАЗам,
Паўнюткім бульбы, на шашы...
А час далейшы, што ён скажа,
Што прынясе нам для душы!

Ты добры, верасень, гусляр быў,
А што ў наступным для людзей,
Якія подыхі і фарбы
І крутабег якіх падзей!

І роздум неспакойным зернем
Пачаў у сэрцы прарастаць —
Шкада таго, чаго не вернеш,
Цікава ж новае пазнаць!

Кастусь КІРЭЕНКА

ПАЧАТАК ГОДА

Пачатак года, як цябе
не ўславіць!
Не першы я. І ці ж апошні! Не.
Нясу хвалу
Вялікай мудрай з'яве,
Што ўсхваляваць нікога не міне.

Пачатак года — гэта так звычайна.
Здаецца, ўсё знаёма. Як заўжды.
Але чаму штораз салодкай
тайнай
Гучаць нам
Яго першыя сляды!

Вітанні, смех, рукі знаёмай
поціск.
Яны не тыя, што былі раней.
Пачуеш раптам кліч у нейкай
ноце,
Дужэй заб'ецца сэрца і паўней.
Глядзіш і верыш: нехта шчасце
дзеліць
Пароўну ўсім —
На ўсе на свеце дні.
І нават над табою рог мяцеліц
Затрубіць так сардэчна ў вышыні.

Пачатак года ўсё рашае проста:
Навошта жыць
І што такое жыць,
Калі не знаць сяброўства
за сяброўства
І чуласцю людской
Не даражыць!

Навошта жыць без праўды
і давер'я!
Пачатак года гоніць гэта прэч!
І ён кідае радасныя зерні
На ўсе шляхі
Спатканняў і сустрэч.

Яму нічога для людзей
не шкода —
Няхай вас, людзі, смутак
не кране!

Пачатак года,
Мой пачатак года,
Паклон табе, што радасць даў
і мне.

Іду далей. Іду ў жыццё, як трэба.
З сябрамі поплеч. Чую сэрцаў
стук.
Крычу зямлі: няўжо пад мірным
небам
Не можна жыць
Без гора і прынук!

Іду і веру: нехта шчасце дзеліць
Пароўну ўсім —
На ўсе на свеце дні.
Бо нават несціхны рог мяцеліц
Адказвае так шчыра з вышыні!

Казімір КАМЕЙША

МАЛЕНСТВА

Як вогнішча з астылым жарам,
Пакінута даўно маленства.
На сцежках тых,
дзе крокі лісцвяных
пажараў,
Дзе ветру прынямонскага
шаленства,
Вярнуцца да маленства
часта хочацца,
Пагрэцца на яго кастрах.
Ды толькі адляцеўшая пара
Нас вогнішчамі
сустракае холадна.
Мы палім сёння у тайзе кастры.
У нашае крыві струменіць
сталасць.
Няўжо і радасць гэтае пары
Для нас пасля далёкай стане!

Янка СКРЫГАН

АПАВЯДАННЕ

У СТАРЫМ ДОМЕ

Яна адчыніла дзверы і сумелася. Перакінуўшы цераз руку плашч, на ганку стаяў чалавек і глядзеў на яе ў трывожным чаканні. Нешта знаёмае, але далёкае было ў паставе яго галавы, у адкрытым ілбе, у вачах, што глядзелі чутачку прыжмурана. Нарэшце, калі ён, як бы прызнаўшы, усміхнуўся— і яна адразу пазнала і гэтую ўсмешку, і паставу галавы, і манеру глядзець трошачкі з-пад ілба.

— Кастусь! Няўжо гэта ты? Ну дык заходзь жа, заходзь, чаго мы стаімо. Божа мой, хто б мог чакаць!

І тут жа яна замітусілася, успомніўшы, што на ёй хатні халат, раскіданая прычоска, на босых нагах пантофлі. Правёўшы ў пакой, сказала: «Пачакай, я зараз»,— і знікла ў бакоўцы, баючыся нават аглянуцца.

Ён азірнуў пакой. Здавалася, усё ў ім, як і некалі: старадаўняя канапа з патрэсканым скураным сядзеннем, два глыбокія крэслы, абабітыя калісьці яркім, а цяпер вышмуленым аксамітам, у адным кутку—этажэрка з пакуль што паложанымі газетамі, часопісамі, у другім—у дубовай кадушцы пальма з зацвярдзелым бляскам на шырокіх цяжкіх лістах. За вокнамі тыя самыя густыя кусты бэзу, ад якіх у пакоі як бы вечна спачывае зялёны халаднаваты цень. Усё гэта дыхнула на яго знаёмай даўняй утульнасцю. Толькі пісьмовы столік пры сцяне з кнігамі і стосам вучнёўскіх сшыткаў на ім, быў тут новы і парушаў тую даўнасць.

Яна ўвайшла порстка, паружавелая, свежая, і ён здзівіўся, што ёй вельмі пасуе і гэтая жвавасць, і незнаёмая ў ёй папаўнеласць, і плашч спакойнага тону, што надало ёй строгую сціпласць, і прычоска, што невядома нават чым так ажывіла ўвесь твар. «Якая яна яшчэ маладая,—падумаў ён,—І якая прыгожая, я нават і не мысліў сабе».

— Дык чаго ж ты стаіш, сядай,— сказала яна.—Нават плашча з рукі не зняў. Давай сюды. Я так рада, што ты зайшоў.

Яна павесіла плашч, паказала на крэсла перад канапаю, сама села ў другое, уціснуўшыся ў цень пад пальму, каб лепш было глядзець адтуль.

— Я так рада, што ты зайшоў,— паўтарыла яна.—Проста не верыцца.

— Я, ведаеш, колькі шукаў цябе? Яшчэ ўчора прыехаў і пусціўся на вашу вуліцу. Іду—і нічога пазнаць не магу. Я памятаў, што тут у вас, як у сяле: у кожнага свой домік з дворыкам, з брамкаю, з агародчыкам, з вішнёвым садам, як у даўнейшым мяшчанскім прыгарадзе. Аж тут пачастаўлялі камяніц, разбудаваліся, усё стала іначай. Я ішоў і баяўся, што не знайду ніякага следу.

— Бо ты ж даўно не быў тут.

— Колькі ж гэта мы не бачыліся? Гадоў з дваццаць, мабыць?

— Больш, Кастусь. Я цябе доўга не магла пазнаць.

— Але, я бачыў. І сам быў збянтэжыўся.

— Як жа тут аказаўся? Дзе жывеш? Што робіш?

— Знарок прыехаў. Быў па поўдні, лячыўся, адпачываў. А жыву ў Сібіры, там цяпер работы, дай, божа. Ну, і падумаў: я ж тут, па нашых сібірскіх маштабах, зусім блізка, дай зраблю гэты крук.

Яна глядзела на яго твар, дзівячыся, колькі новых, незнаёмых рысак напісалі на ім гады. Лоб стаў большы, на ім смела падняліся залысіны, на скронях асцярожныя іскаркі сівізны. Вочы пасушэлі, навучыліся глядзець строга, яна пазнавала і не пазнавала іх бляск.

— Я так часта ўспамінала цябе.

— Я доўга блудзіў, усё шукаў Гэлінага дома. Знайшоў адзін, але доўга не мог прызнаць: прыціснуты камяніцамі, ён стаў маленькі, адзінокі. І як бы не так стаіць. Той стаяў удоўж вуліцы, а гэты—упоперак.

— Упоперак ён і стаяў.

— Ну, от бачыш, забыўся. Але, гляджу, ганак—той. Шырокі, зашклёны, ты ж яго памятаеш?

— Памятаю, Кастусь, яшчэ і як.

— Ну от, з гадзіну кружыў каля яго. Хацеў у каго папытацца, але падумаў: навошта? Усё роўна я ж ведаю, што яе няма.

Ён перачакаў, спадзеючыся, што яна скажа, тут ці не тут Гэля. Але яна прамаўчала.

— Ну, тады пайшоў шукаць цябе.

— Я вельмі рада, Кастусь. Я так часта ўспамінала цябе.

Пасля яны сядзелі за сталом. Яна сабрала закуску з памідорамі свайго догляду, з маласольнымі гурочкамі, вяндлінай, паставіла пляшку віна, якое зберагала на самы дарагі выпадак. На дварэ ўжо быў вечар, даўно былі зачынены аканіцы, на ўсе лямпкі ў пакоі гарэла святло. Было ўсё перагаворана, успомнена, а ім здавалася, што яны яшчэ і не гаварылі.

— Памятаеш могілкі, гэта ж недзе недалёка ад вас? Увечары—таямнічаюць, помнікі, агарожы, густыя кусты, раса, і мы да позняй ночы любілі гуляць там. І нейкі хлопец часта круціўся каля вас, я ўжо забыўся, хто ён. Ён усё любіў бегаць навыперадкі.

— А помніш клуб Крэйнаса? Мы там ставілі «Паўлінку», і ты іграў Якіма Сароку.

— Ага. За Паўлінку была Гэля.

— Бо ты ж так хацеў. А яна ўпіралася. Каб не цалавацца з табою.

— А як першы раз сустрэўся з вамі, памятаеш? Вы ўдзвюх прыйшлі ў тэхнікумаўскі інтэрнат да нашых дзяўчат. Я нават не ведаў, што вы зналіся з імі. І я зайшоў туды нечага, і аж збянтэжыўся, стаіце вы, абедзве тоненькія, зграбненькія, здавалася, што ў вачах у вас свеціць сонца, мяне аж асляпіла. І Гэля, ні з сяго ні з таго запрасіла мяне на вечарынку. Канешне, я адразу згадзіўся. Памятаеш тую вечарынку ў цябе?

— Памятаю, а як жа. Таго вечара я ніколі не забуду.

— Ну вось, а пасля я ні дзень, ні ноч не знаходзіў сабе месца. Не мог без яе быць ні хвіліны. І аднойчы мы за нешта былі пасварыліся. За што толькі мы сварыліся, госпадзі! Якое самае найдрабнейшае глупства, а яна ўскіпіць, павернецца і пойдзе. Пасля не раз яна так рабіла. І я цэлыя дні прастойваў каля яе дома, каб дапільнаваць, калі яна выйдзе. І на вуліцы ўсё шукаў яе, думаў — сустрэну. Пройдзе якая дзяўчына, хоць чутачку русявая, у лёгкай сукенцы, і я думаю, што гэта яна, даганяю. Зірну ў твар—божа мой, пачвара! Тады ўсе мне здаваліся пачварамі. Пра цябе не кажу, ты была яе палавіна, значыць, такая ж самая харошая.

Па вуліцы прайшла машына, мабыць, нечым цяжка нагружаная, ад яе натужнага гудзення тоненька зазвінелі шыбы. Каб перачакаць гэтае гудзенне, памаўчалі. Ён падняў келіх, адпіў з яго.

— Я ўсё памятаю: і вашы сваркі, і замірэнні,—сказала яна, счакаўшы. — Нялёгка мне даваліся яны.

— І ўсё-такі гэта было хораша. Што хочаш гавары, а гэта было хораша, Зося. І той ганак, якога я сёння шукаў. Аднойчы мы доўга гулялі, я правёў яе дадому, і ў гэтым ганку мы яшчэ бог ведае колькі стаялі. А назаўтра я ўсё не мог даўмецца, чаму ў яе на губе чорная плямка. А калі дадумаў, то быў без меры шчаслівы. Мне хацелася, каб усе бачылі ў яе гэтую чорную плямку, каб усе ведалі, што гэта я цалаваў Гэлю.

— І гэта я памятаю, Кастусь. Я табе кажу, я ўсё ведала, можа, больш за яе. Нават памятаю, як ты запрасіў яе на вяселле, калі ў цябе выходзіла замуж сястра. Яна адна не паехала, сказала, каб ты запрасіў і мяне. Мы ехалі ў санях, зіма, мароз, усё чакалі, калі ж пакажацца ваша сяло. І баяліся, каб не паадморожваць шчок, закрываліся так, што відны былі адны толькі вочы, і нам цяжка было рагатаць. І тады ты ўсю ноч танцаваў з ёю.

— Але, але. Памятаю. Яна вельмі лёгка танцавала.

— Гэля ўся была лёгкая,—сказала яна раптам жорстка.—Усё ёй давалася вельмі лёгка.

Настала часіна, калі кожнаму захацелася пабыць з самім сабою. Маладосць, як бы яна ні была пражыта, ніколі не пакідае нас. Ад яе на ўсё жыццё мы нясём і свежасць, і шуканні, і трывогу душы, і ласку сэрца. І бясконца хочам яе паўтараць. З гадамі мы становімся мудрэй і кажам сабе, што цяпер бы нешта паправілі, нешта зрабілі іначай, але гэтая папраўка на мудрасць—толькі суцеха. Нічога не паправілі б, бо маладосць не любіць гатовых дарог. Можа ў тым і ўсё хараство яе, што яна вучыць нашу сталасць.

Ён папытаўся, ці не асталося ў яе фотакартак. З этажаркі яна дастала зацямнелы альбом з медзянымі зашчапкамі. Там былі пажылыя людзі—яе бацькі, сваякі, бабулі і дзядкі, яны сядзелі ў строгіх позах з павыцягванымі на каленях рукамі; былі дзеці-сасункі на разасланых пялёнках, у мацярок на руках; былі сябры і сяброўкі, далёкія знаёмыя, парамі і ў гурце, цывільныя і ваенныя, у ватоўках і ў шлюбных строях, з позамі заліхвацкімі і млявымі. Яна спрабавала тлумачыць, што гэта за людзі, якая з кім ступень сваяўства ці знакамосці, але ён нецярпліва гартаў старонкі далей і далей. Нарэшце ўбачыў-такі. Ну, канечне, вось такая была ў яе і ўсмешка, і здзіўленыя вочы, і чутачку пухлявая ніжняя губа, і недаступная ласкаваць, і строгасць.

— Ты даўно бачыла яе?—папытаўся ён і загарнуў альбом.—Едучы сюды, у душы спадзяваўся, што сустрэнуся з ёю.

— Даўно, Кастусь. Разы два яна прыязджала, але вельмі накоратка. Ну, і нешта не зусім у нас ладзілася з ёю. Яна ж выйшла замуж, ты ведаеш?

— Ведаю. Мне здаецца, што я сам вінаваты ў гэтым. Каб я тады не паехаў...

— Не, Кастусь, мабыць, ты добра зрабіў, што паехаў.

— Чаму?

— Яна таго кінула.

— Ну што ж, бываюць няўдачы.

— Не, не кажы ты, Кастусь. Пасля гэтых няўдач было ў яе бог ведае колькі. З год яна пабыла адна, нікога і бачыць не хацела. Адале пачала як бы спяшацца, не разбіралася ні ў кім і ні ў чым. Як лёгка сыходзілася, так лёгка і пакідала. Я ж кажу, уся яна была лёгкая, мне было вельмі шкода яе. Яна стала нейкая бессардэчная, ліхая ў душы. Бывала, скажаш ёй: «Што ты робіш, Гэля, апамятайся»,— а яна здзівіць вочы, паверне плячом: «А што ж тут такое, калі яны мне не па душы».

Ён уздыхнуў, нахмурыўся, пагладзіў лоб.

— А пасля тут паявіўся нейкі начальнік з торфу, з вырабатак. Пажылы ўжо, суровы такі, ні віду ў яго, ні складу. Бог ведае, што сталася з ёю—паехала з ім. Жывуць недзе на балоце, пад Бабруйскам. Двое дзяцей у іх. Ну, прыязджала, зайшла да мяне на часінку. Я не бачыла, каб яна была шчаслівая.

Ён выпіў келіх да дна, падняўся, прайшоў па пакоі. Пагладзіў тугі пальмавы ліст. Зноў апусціўся ў крэсла.

— Ну, добра, раскажы пра сябе, Зося. Я так і не папытаўся дагэтуль.

—Пра сябе—што ж расказваць? Як бачыш, жыву адна. Муж загінуў у вайну, тут жа ў нас была партызанская зона. Я таксама была звязана з лесам, але выкруцілася, ніхто не выдаў. Выгадавала дзвюх дочак і вельмі шчаслівая. Абедзве ўжо выйшлі ў людзі. Адна ў Ленінградзе жыве, замужам, інжынер. Другая ў Мінску канчае кансерваторыю. Ты бачыш, які багаты ў мяне дом? А сама настаўнічаю, сваю работу люблю. Чаго ж мне больш хацець?

— А ў мяне сям'я не ўдалася, Зося. Ну, як табе сказаць: ёсць дастатак, пашана, ёсць жонка і сын, а шчасця няма. От я ў Сібіры, гадоў з дзесяць ужо, сямігодку там пачынаў, будую плаціны, электрастанцыі, а яны—у Маскве. І нішто нас не цягне адно да аднаго, нішто не звязвае, як чужыя.

— Гэта ж цяжка, Кастусь.

— Вельмі. А што ж зробіш?

Ён задумаўся, але, відаць, не над гэтым сваім горам. Нешта другое жыло ў ім. Прыжмураныя вочы не тужылі, а марылі. І паступова твар яго праясніўся, а на губы лягла ціхая ўсмешка.

— Не, усё было добра ў нас тады, усё было добра. Гэля любіла мяне, я знаю. Калі я паехаў, яна плакала. І... я пасля ўжо дазнаўся, што яна вяла дзённік. І пісала ў ім пра мяне... Можа, каб я ведаў пра гэта раней, то ўсё было б іначай.

— Ты пра многае не ведаў, Кастусь. Можа гэта і добра нават.

Было ўжо за поўнач, калі ён зняў з вешалкі плашч.

— Ну, бывай здарова, Зося. Я сёння шчаслівы. Вельмі шчаслівы. Што пабачыў цябе, што мы пагаварылі. Можа, калі сустрэнеш Гэлю—не злуй на яе. Перадай маё прывітанне. Скажы, што быў, хацеў яе бачыць. Яна ўсё зразумее...

Калі ён пайшоў, яна доўга яшчэ сядзела адна. Яна яшчэ як бы гаварыла з ім. Ты ўсё пераблытаў, Кастусь, ты нічога не ведаеш і не памятаеш, гаварыла яна. Не яна, а я плакала, калі ты паехаў. Не яна, а я запрашала цябе на вечарынку. І за ўсе вашы сваркі і прымірэнні перажывала не яна, а я. Ты не ведаеш і таго, з якім горам я паехала на тое вяселле, калі знала, што запрашаў ты мяне толькі дзеля яе. Ты кажаш, што каля нас часта круціўся нейкі хлопец. А не ведаеш, што ён два гады хадзіў за мною, а я на яго глядзець не хацела. І на другі ж дзень, як ты паехаў, выйшла за яго замуж. І не яна, а я пісала дзённік...

Ілюстрацыя мастака Ф. Бараноўскага да аповесці В. Быкава «Альпійская балада».

ДАРОГІ СКРЫЖАВАЛІСЯ ў МІНСКУ

ІВАН НОВІКАЎ

Урывак з дакументальнай аповесці

Дарога вяла на Мінск. Праз акно аўтобуса Адам Дземідзецкі-Дземідовіч бачыў, як прабягалі міма кіламетровыя слупы; ён нават спрабаваў лічыць іх. Побач сядзеў оберлейтэнант Зітлер. Ён часта нахіляўся да пана Адама, распытваючы пра Беларусь і беларусаў. Але што цікавае Зітлеру мог расказаць Дземідзецкі-Дземідовіч? Бадай нічога. Усё, што было звязана ў яго з Беларуссю, аддзелена дваццаццю гадамі.

Некалі бацька меў тут маёнтак. І ўсё было добра, гладка, нават першая сусветная вайна не змагла парушыць спакойнага жыцця паручніка. Хіба гэта цікава для гера Зітлера?

А потым рэвалюцыя... Адна, другая... Пан Адам ледзьве вынес ногі. Дапёр да самай Варшавы і толькі там аддыхаўся. Адзінае, што ён захаваў пры сабе, — гэта лютую нянавісць да бальшавікоў. Пан Юзаф Пілсудскі ўмеў цаніць такія якасці. Ён прымеціў беглага паручніка і наблізіў да сябе. Зайздроснікі часта бачылі Дземідзецкага-Дземідовіча ў свіце маршалка... Потым пачаўся спад. Давялося стаць цывільным. Але і тады пан Адам не разгубіўся, не страціў шляхецкага гонару. Гер Зітлер можа не сумняваццa: патомны шляхціц, сапраўдны поляк умее шанаваць свой гонар! Ён не пайшоў, як іншыя, на чорную работу. Шаснаццаць год працаваў інспектарам па гаспадарчай частцы ў Лодзінскім ваяводскім упраўленні. Калі прыйшлі немцы, ён, разумеючы вялікую місію нямецкай арміі, аддаў свой добры, прасторны дом пад вайсковую ўстачову. Нават калі ўлада канфіскавала краму, Дземідзецкі не меў нічога супроць. Ён сабраўся і паехаў у Варшаву да жонкі, якая таксама трымала краму.

Не раз марыў ён стаць гаспадаром буйной крамы з вялізнымі, багата аздобленымі вітрынамі. Уяўлялася, як, зноў завалодаўшы сваім маёнткам пад Пухавічамі, зробіцца мільянерам, і ўсе гаспадары буйных крам будуць ветліва вітацца з ім.

Мары, мары, колькі іх вынашана, выпеставана нават у самыя цяжкія хвіліны!

У краму да пана Адама рэдка хто заглядаў, хіба толькі знаёмыя. Неяк аднойчы, у канцы 1940 года, зайшлі прыяцелі—Конрад Піятроўскі і Збігнеў Свянціцкі. Яны па сакрэце паведамілі, што немцы нешта рыхтуюць супроць Саветаў і з гэтай мэтай ужо створаны Беларускі камітэт, у які можа ўступіць кожны, хто ненавідзіць камуністаў.

— А што мае рабіць той камітэт, пане Конрад ?— пацікавіўся Дземідзецкі.

— Пакуль што не многа: наладжваць лекцыі, даклады пра бальшавікоў, рыхтавацца. А далей знойдуцца справы больш значныя. Нас чакае вялікая будучыня пад сцягам Германіі, пан Адам.

— То можа панове і мяне прымуць у той Беларускі камітэт?

— А чаму б і не? Вы, пан Адам, нават беларускую мову ведаеце. Як жа вас не прыняць? Абавязкова прыходзьце.

Пан Дземідзецкі-Дземідовіч пазнаёміўся з членам рады Беларускага камітэта Янам Станкевічам, а праз яго — са старшынёй Міколам Шчорсам, з Уладзімірам Лазарэвічам, Усеваладам Радзько і прапанаваў ім свае паслугі.

Зітлер слухаў уважліва. Ён нават не глядзеў у акно. Увагу гестапаўца цалкам займала грузная асоба Дземідзецкага-Дземідовіча. Обер-лейтэнанту хацелася лепш зразумець псіхалогію гэтага шляхціца, якому аводзілася немалая роля ў стварэнні новай адміністрацыі Мінска. Позірк Зітлера спыніўся на правай руцэ пана Адама, на якой была старанна вытатуіравана гадзюка.

«Нішто сабе эмблемка», — падумаў Зітлер.

У надзейнасці Дземідзецкага оберлейтэнант не сумняваўся. Варшаўскае СД рэкамендавала яго, як самага здольнага агента. Групу людзей, якая называла сябе Беларускім камітэтам, узначальваў Вітальд Тумаш, якому рыхтавалася пасада бургамістра Мінска. Дарэчы, у Тумаша былі сякія-такія сувязі ў горадзе. Па праўдзе кажучы, сувязі невялікія, асаблівай каштоўнасці яны не мелі, але на бязрыб'і і рак рыба.

Большасць членаў камітэта падбіралася ў Польшчы. Гэта было даручана варшаўскаму СД. Папярэднюю работу праводзілі Мікола Шчорс і Дзірынг, маёр СД, які быў прызначаны старшым над групай, накіраванай у Мінск. Дарэчы, Шчорс і пазнаёміў тады Зітлера і Тумаша з Дземідзецкім і астатнімі варшаўскімі агентамі СД, падрыхтаванымі для работы ў Беларусі.

Дземідзецкі спачатку не вельмі прыхільна ставіўся да Тумаша. Былі яны з ім у адным рангу, аднолькавыя пачуцці кіравалі іх учынкамі. Здаецца, ім бы адчуваць блізкасць, узаемную сімпатыю. Але гэтага не было. З першага ж погляду пан Адам адчуў глыбокую зайздрасць да абыходлівага, нейкага коўзкага, не зусім зразумелага Тумаша. Ужо тое, што Тумаш едзе з самага Берліна, што ён прайшоў добрую нямецкую вывучку, ставіла іх у няроўнае становішча. Дземідзецкі лічыў, што лепшага бургамістра для Мінска, чым ён, пан Адам, нельга было б знайсці. Ніхто гэтак, як ён, не прагнуў вярнуцца ў гэты горад і ніхто, на яго думку, так добра не ведаў мінчан і не меў такой вялікай адміністрацыйнай практыкі. І тым не менш, бургамістрам сдзе Тумаш, а пана Адама даюць яму ў памочнікі. Гэта ён зразумеў са слоў Міколы Шчорса.

...Мінск сустрэў іх мёртвай маўклівасцю і пахам гарэлага. Здавалася, усё тут прапахла дымам — і дамы, і руіны, і дрэвы, і тэлеграфныя слупы.

Тых, хто прыехаў сюды наводзіць «новы парадак», такі малюнак суцяшаў і радаваў. Хіба могуць жыхары, якім давялося адчуць сілу і агонь нямецкай арміі, супраціўляцца? Руіны Мінска супакойвалі.

Аўтобус спыніўся каля Дома ўрада.

Першыя вылезлі немцы, за імі астатнія. Моўчкі, азіраючы бязлюдныя вуліцы, яны падышлі да будынка, на якім яшчэ вісела напаўразбітая шыльда інстытута народнай гаспадаркі. Тут размяшчалася мінскае СД. Сюды Зітлер і прывёў будучых кіраўнікоў акупіраванага горада.

Большая частка будынка пустаравала. Агентам СД адвялі пакой на другім паверсе, дзе ўжо стаялі засланыя ложкі, тумбачкі са шклянкамі і графінамі.

Зітлер папярэдзіў:

— Гэта часовы прытулак. Знойдзем лепшы дом — перабяромся туды.

Тумаша і Лазарэвіча часта выклікалі да начальства. Вяртаючыся, яны нічога пра свае справы не гаварылі.

Толькі пасля Дземідзецкі-Дземідовіч зразумеў, куды яны хадзілі.

Неяк, вярнуўшыся, Тумаш папярэдзіў:

— Польскае слова «пан» забудзьце. Будзем карыстацца беларускім — спадар.

— Нешта я не чуў раней такога слова, — запярэчыў пан Адам. Яму больш імпанавала слова «пан». Але Тумаш адрэзаў:

— То не ваша справа. Як загадана, так і гаварыце. Немцы ўхвалілі слова «спадар», і вы мусіце ім карыстацца.

— Ды мне што, — пагадзіўся пан Адам. — Спадар дык спадар...

Праз два дні ў пакой завітаў супрацоўнік СД.

— Збірайцеся! — сказаў ён Усеваладу Радзько. — Паедзем у Віцебск. Вас прызначылі туды бургамістрам. Будзем наводзіць парадак...

— Бывайце, спадары!—весела гукнуў Радзько на развітанне. — Запрашаю ў госці ў Віцебск...

У Дземідзецкага заныла сэрца: «Во, другіх бяруць на высокія пасады, даюць такі прастор, а ты сядзі, чакай...»

Нарэшце, на трэці дзень Тумаш прыйшоў ад начальніка мінскага СД і сказаў:

— Спадары, сёння ў нас гістарычны дзень. Нам даручана сфарміраваць гарадскую ўправу Мінска. Апранайцеся у самае лепшае.

Ідучы па былой Камсамольскай вуліцы, Тумаш паказаў на чатырохпавярховы дом:

— Вось тут будзе наша рэзідэнцыя. Прашу, спадары...

— Вам першаму адчыняць дзверы, — прапанаваў Дземідзецкі-Дземідовіч. — Вы наш галава...

— Ну, калі так...

У прасторным кабінеце ўжо сядзела каля тузіна цывільных. Пры з'яўленні Тумаша ўсе яны, як па камандзе, усталі і нізка пакланіліся.

— Дзень добры, шаноўныя спа-

Заканчэнне на 4-й стар.

Станіслаў ШУШКЕВІЧ

ПЛАЧУЦЬ СЦЕНЫ

Чую раніцай ціхі стук,
Нібы дзяцел у ствол—цюк, цюк,
цюк...

Пэўна, гоніць іржавы цвік
Мой сусед у стары чаравік.

Дзе там! З рынку прынёс дыван.
Нібы з рэдзіва той саткан.
І ўбівае не ў чаравік,
А ў сцяну непадатлівы цвік.

Ён развесіць «красу»-дыван—
Белых лебедзяў караван
На лазурку між траў і гор
Як мастацтва высокі ўзор...

Ах вы, рыначныя «дываны»!..
Плача з крыўдаю бель сцяны.

Кастусь КІРЭЕНКА

ПУЦІНА

Вятры
ваўкамі ашалелымі
Імкліва гналі
хваль гурты.
А тыя,
як авечкі белыя,
Ібамі
білі у барты.
Нібыта коні адзічэлыя,
Чаўны
ўставалі на дыбы,
Ды мы,
гарачыя,
ўспацелыя,
Стаялі моцна,
як дубы.
І, расхрыстаныя
і босыя,
Гурбой—аж мускулы гулі! —
Цягнулі сеці.

Славамір ХАДАРОНАК

Злымі восамі
Пяклі далоні
мазалі.
Калі ж
сазаны мяккабрухія
У баржы падалі
з каўшоў,
Слабей,
здалося,
хвалі бухалі
І шторм сярдзіты
адышоў.
Няўрымслівую песню звонкую
Мы
дружна ўскінулі
ўгару
І пад лагодным
зыркім сонцам
Сушылі
мокрую махру...

ЗАПІСНОЙ КНІЖЦЫ—100 ГОД

Нядаўна, калі я знаходзіўся ў Польскай Народнай Рэспубліцы, у рукапісным аддзеле Нацыянальнай бібліятэкі ў Варшаве маю ўвагу прыцягнула невялікая, пажаўцелая ад часу запісная кніжка. На першай яе старонцы каліграфічным почыркам выведзена: «Нататкі паўстанца 1863 года ў Магілёўскай турме». Далей ідзе неразборлівы подпіс. Невядомы ўладальнік кніжкі, якога царскія ўлады прыгаварылі да катаржных работ, прысвяціў яе сваёй нявесце Ядвізе. Аб гэтым сведчыць прачулы зварот. Развітваючыся з нявестай, аўтар просіць, каб яна зберагла кніжку, калі тая ўсё ж трапіць у яе рукі, зберагла для гісторыі імёны тых, хто ахвяраваў жыццём у імя вызвалення радзімы. Ці атрымала Ядвіга кніжку і якім чынам яна трапіла ў Варшаву — пакуль што цяжка сказаць.

У запісной кніжцы пакінулі аўтографы ўсе ўдзельнікі паўстання 1863 года, якія трапілі ў Магілёўскую турму. Вось некалькі запісаў: «Аляксей Вайніловіч, вучань з Магілёўскай губерні, прыгавораны да вечнай ссылкі ў Сібір», «Уладзімір Корбут — родам з Мінска», «Гордан Пароскі — вучань Слуцкай гімназіі», «Альфрэд Завада, з Гродзенскай губерні, Шчучын, да катаргі на 8 год», «Эдвард Матушэвіч, фартэпіянны майстар з Мінскай губ

МЫ ЛЮБІЛІ ЯГО

Янка Скрыган у «Сваёй аповесці» («Полымя» № 2 за мінулы год) пісаў: «Канчаўся універсітэт, і рабілася шкада добрых настаўнікаў. Мы любілі Замоціна, Вальфсона, Пінтуховіча, Фохта, Саўсуна».

Так, мы, студэнты дваццатых-трыццатых гадоў, любілі Івана Іванавіча Замоціна, любілі шчыра, аддана. Каля пяці тысяч друкаваных старонак па гісторыі літаратуры належыць пяру І. Замоціна. Яны «могуць быць прызнаны выдатнымі, якія не ўступаюць па сваіх вартасцях працам тых нямногіх прадстаўнікоў рускай літаратуры, якія ўжо з'яўляюцца членамі-карэспандэнтамі нашай Акадэміі навук», — так пісалі пра І. Замоціна дзеячы рускай культуры Я. Карскі, В. Пертц, Б. Ляпуноў.

І. Замоцін нарадзіўся ў канцы 1873 года ў сям'і селяніна былой Цвярской губерні. Сярэднюю адукацыю будучы вучоны атрымаў у Пецярбургу і Пскове, вышэйшую — у Пецярбургскім гісторыка-філалагічным інстытуце. У 1904 годзе ў Казанскім універсітэце І. Замоцін абараніў дысертацыю на ступень магістра рускай літаратуры. У гэтым жа годзе ён распачаў педагагічна-выкладчыцкую дзейнасць у Варшаўскім і Пецярбургскім універсітэтах. З 1908 года ён — доктар рускай славеснасці і прафесар Варшаўскага універсітэта.

У 1922 годзе Іван Іванавіч Замоцін быў запрошаны прафесарам Беларускага дзяржаўнага універсітэта і па 1928 год выкладаў рускую літаратуру на рабфаку БДУ. Доўгі час І. Замоцін быў старшынёй літаратурнай камісіі педфака. У студзені 1925 года ён стаў сапраўдным членам Інстытута беларускай культуры, а са снежня 1928 года ён зацверджаны правадзейным членам (акадэмікам) Беларускай акадэміі навук. З 1931 года І. Замоцін працуе дырэктарам Інстытута літаратуры і мастацтва АН БССР, а пасля прафесарам кафедры літаратуры Мінскага Вышэйшага педагагічнага інстытута, дзе і давялося мне слухаць яго лекцыі.

Іван Іванавіч Замоцін плённа працаваў у галіне развіцця беларускай літаратуры. Крытычныя артыкулы акадэміка І. Замоціна «Шляхі развіцця беларускай літаратуры», «Драмы Я. Купалы», «Максім Багдановіч (Крытычна-біяграфічны нарыс)», «Творчасць Крапівы», «Янка Купала (Да трыццацігоддзя літаратурнай дзейнасці)», «Высокі ўзор мастацкага рэалізму (Аповесць Якуба Коласа «Дрыгва»)», «Лірыка Якуба Коласа 1930-35 гг.», «Аб паэме Якуба Коласа «На шляхах волі» сведчаць аб яго адданасці справе развіцця нашай роднай літаратуры.

Пяру акадэміка І. Замоціна належыць больш 140 навуковых прац па гісторыі рускай і беларускай літаратуры.

І. І. Замоцін загінуў у гады культу Сталіна, несправядліва рэпрэсіраваны.

У Беларускім дзяржаўным універсітэце і Мінскім Вышэйшым педагагічным інстытуце, дзе доўгія гады працаваў І. Замоцін, вучыліся вядомыя беларускія пісьменнікі і паэты Кузьма Чорны, Кандрат Крапіва, Пятрусь Броўка, Пятро Глебка, Янка Скрыган, Сяргей Грахоўскі, Станіслаў Шушкевіч і іншыя. Усе яны — я, пэўна, не памылюся — удзячны акадэміку Івану Іванавічу Замоціну.

Я. ГАВАРУШКА,
дырэктар Смалявіцкага дзіцячага дома № 1.

ЗВОНКІЯ ДЗІЦЯЧЫЯ ГАЛАСЫ

СЕЗОН 63-64

На сцэне канцэртнай залы Беларускай філармоніі—дзяўчынкі і хлопчыкі старэйшага школьнага ўзросту ў піянерскіх касцюмах. Яны спяваюць звонка і весела, задорна і з захапленнем. Дырыжыруе высокі статны мужчына з прыгожай сівой галавой. Рухі рук яго то плаўныя, мяккія і стрыманыя, то энергічныя і імклівыя. Яны вельмі выразныя, у іх гучыць музыка.

Хто ён—гэты дырыжор? Хто такія яго юныя сябры? Гэта госці з Масквы—дзіцячы хор Інстытута мастацкага выхавання Акадэміі педагагічных навук РСФСР і яго кіраўнік народны артыст РСФСР, прафесар Уладзіслаў Сакалоў—адзін з буйнейшых харавых дырыжораў нашай краіны. Шырокай папулярнасцю карыстаецца ўзначальваемы ім прафесіянальны Маскоўскі хор, які пабываў у многіх гарадах Савецкага Саюза, у тым ліку ў Мінску (у канцы гэтага месяца хор зноў прыедзе ў Мінск для выканання «Рэквіема» Д. Кабалеўскага).

Нямала часу і энергіі аддае Ул. Сакалоў педагагічнай дзейнасці на харавым факультэце Маскоўскай кансерваторыі. Але дзіцячы хор, створаны ім у 1936 годзе, застаецца, на наш погляд, самай моцнай любоўю славутага дырыжора.

Гэты хор з'яўляецца эксперыментальнай базай, дзе выпрацоўваюцца новыя метады работы са школьнымі харавымі калектывамі, дзе фарміруецца новы рэпертуар. Ужо апублікавана некалькі зборнікаў твораў для дзіцячага хору з рэпертуару харавога калектыву Інстытута мастацкага выхавання.

За тры дні знаходжання ў Мінску хор тры разы выступіў разам з нашым сімфанічным аркестрам (з іх два разы—у дзіцячых сімфанічных ранішніках) і два разы—з самастойнай праграмай (адзін канцэрт паказваўся па тэлебачанні). Апроч таго, прафесар Сакалоў правёў са сваім калектывам адкрыты ўрок, на якім прысутнічала многа музычных педагогаў, студэнтаў, аматараў музыкі. Былі паказаны некаторыя цікавыя прыёмы работы хормайстра са школьным хорам. Удзельнікі хору прадэманстравалі дастаткова высокую пеўчую культуру, уменне спяваць па нотах, мець сувязь з дырыжорам. Вельмі добры лад хору, чысціня і дакладнасць інтаніравання.

З сімфанічным аркестрам (дырыжор К. Крымец) юныя артысты выканалі кантату А. Пахмутавай «Чырвоныя следапыты» (вершы С. Грабеннікава і Н. Дабраніравава) і сюіту латышскага кампазітара М. Зарыня «Нязнайка ў сонечным горадзе» — па кнізе М. Носава «Прыгоды Нязнайкі». Гэта сюіта мае асаблівую цікавасць. Кампазітар Зарынь праявіў сапраўдную музычную дасціпнасць, вынаходлівасць. Музычная мова яго твора вобразная і канкрэтная. Харавая фактура сюіты дастаткова складаная і развітая. Юныя выканаўцы з гонарам справіліся са сваёй задачай.

Менш цікавая, на наш погляд, кантата А. Пахмутавай «Чырвоныя следапыты», большасць частак якой напісаны ва ўсталяваных традыцыях савецкай піянерскай песні.

Найбольшы поспех спадарожнічаў дзіцячаму хору ў яго сольным канцэрце. Іменна тут разнастайнасць рэпертуару і мастацкіх магчымасцей праявіліся асабліва поўна. Вельмі тонка і музычна была праспявана руская народная песня «Повянь, повянь, бурь погодушка» (апрацоўка Ул. Сакалова). Гэта песня, як і некаторыя іншыя, была выканана без акампанементу.

Вельмі ярка, задорна прагучалі дзве песні З. Кампанейца: «Устала сонца» (саліраваў Валодзя Гарачоў) і жартоўная «Бульба», напісаная ў форме трохгалоснай фугі. Выдатна, з сапраўдным віртуозным бляскам была выканана балгарская жартоўная песня-скарагаворка «Пасадзіў я палын». Гэта песня, як і некаторыя іншыя творы, паказаныя ў канцэрце («Месячнае святло» Дэбюсі і вельмі дасціпны твор Моцарта «Рэпетыцыя да канцэрта»), былі атрыманы ад Балгарскага дзіцячага хору, з якім масквічы сябруюць.

Немагчыма пералічыць усё тое добрае, што было выканана ў канцэрце. Але нельга яшчэ не адзначыць двух твораў беларускай музыкі—народнай песні «Ой рэчанька» і песні Ул. Алоўнікава «Радзіма мая дарагая».

Часткаю праграмы дырыжыраваў В. Папоў—малады і бясспрэчна здольны харавы дырыжор. Варта таксама ўпамянуць двух іншых кіраўнікоў хору—хормайстра Л. Абелян і піяністку І. Растоўцаву, якая выдатна акампаніравала юным спевакам.

Канцэрты маскоўскіх школьнікаў—добры падарунак мінскім школьнікам у апошнія дні канікул. Ды і дарослыя аматары спявання засталіся задаволеныя сустрэчай з хорам Інстытута мастацкага выхавання.

Л. АУЭРБАХ.



У Беларускім тэатры оперы і балета за апошнія некалькі месяцаў набылі новае жыццё, можна сказаць, нанава нарадзіліся на свет два оперныя творы. Адзін з іх — опера рускага кампазітара-класіка С. Танеева «Арэстэя», якая ніколі не ставілася на савецкай сцэне, а другая — «Яснае світанне» беларускага кампазітара А. Туранкова. Апошняя была ўпершыню пастаўлена да 40-годдзя нашай рэспублікі. І вось праз пяць гадоў гэтая опера, прысвечаная ўз'яднанню заходніх зямель Беларусі ў адзінай сацыялістычнай дзяржаве, зноў загучала на сцэне нашага тэатра. «Яснае світанне», прэм'ера якой адбылася 12 студзеня, ідзе ў новай музычна-сцэнічнай рэдакцыі, ажыццёўленай аўтарам лібрэта паэтам А. Бачылам і кампазітарам Г. Вагнерам разам з галоўным дырыжорам Л. Любімавым, галоўным рэжысёрам Д. Смолічам і галоўным мастаком Я. Чамадуравым. На прэм'еры вядучыя партыі ў оперным спектаклі выконвалі — Б. Нікольскі (Мікола), Л. Галушкіна (Марына), В. Ганчарэнка (Лагоўскі), І. Саронін (Сцяпан), В. Чарнабаеў (пан Гадлеўскі), С. Вяавоцкая (Юзэфа), В. Глушакоў (пан Вронэк) і іншыя.

На здымку — сцэна са спектакля.

Фота Ул. КРУКА.

Падзеі. Факты. Навіны

△ Гарадская бібліятэка імя Янкі Купалы і масавая бібліятэка № 1 Заводскага раёна г. Мінска заваявалі ганаровае званне «Бібліятэка выдатнай работы».

Л. ФРЫД.

△ Гомельскі абласны Дом народнай творчасці адкрыў музычна-харавую аднагадовую студыю для ўдзельнікаў Азершчынскага народнага хору. У ёй займаецца 30 чалавек. Заняткі вядзе на грамадскіх асновах музыказнаўца Мікалай Сакалоў. Навучэнцы авалодваюць музычнай граматай, нотамі. Пасля заканчэння вучобы яны атрымаюць магчымасць паступіць у сярэднія музычныя навучальныя ўстановы.

А. ЮШКО.

△ Вялікую метадычна-творчую работу сярод студэнтаў вядзе калектыў выкладчыкаў мастацка-графічнага факультэта Віцебскага педінстытута. На факультэце арганізаван абменны фонд студэнцкіх работ Ленінградскага і Мінскага мастацкіх інстытутаў. Перыядычна наладжваюцца выстаўкі лепшых плакатаў, пейзажаў.

Ю. ДОКТАРАЎ.

СКАРБ ДЛЯ МІЛЬЁНАЎ

У адным з прыгажэйшых будынкаў Пецярбурга на рагу Неўскага праспекта і Садовай вуліцы 14 студзеня 1814 года ўпершыню адчыніліся для чытачоў дзверы першай у краіне публічнай бібліятэкі. Гэта была вялікая падзея ў культурным жыцці Расіі. Дзякуючы дадзенаму ёй праву бясплатна атрымліваць два экземпляры ўсіх твораў друку, якія выходзілі на рускай мове і мовах народаў царскай Расіі, публічная бібліятэка хутка стала буйным нацыянальным кнігасховішчам. Нягледзячы на пільную «апеку» самадзяржаўя, на недахоп сродкаў і іншыя сур'ёзныя цяжкасці, бібліятэка аказвала і ў тых складаных умовах вялікую дапамогу айчыннай навуцы і асвеце. З першых дзён свайго існавання яна звязана з многімі вядомымі рускімі пісьменнікамі. На адкрыцці бібліятэкі прысутнічаў Г. Дзяржавін, калі 30 гадоў у ёй працаваў І. Крылоў, яе супрацоўнікамі былі паэты М. Гнедзіч, К. Бацюшкаў, А. Дэльвіг, В. Адоеўскі, пісьменнік М. Загоскін.

«Каштоўны разумовы капітал», як назваў кніжныя багацці публічнай бібліятэкі М. Чарнышэўскі, прыцягваў увагу вучоных, грамадскіх дзеячоў, пісьменнікаў, кампазітараў, мастакоў, студэнцтва, настаўнікаў. У ліку чытачоў бібліятэкі былі Д. Мендзялееў, І. Сечанаў, К. Цімірязеў, В. Бялінскі, М. Чарнышэўскі, М. Дабралюбаў, Д. Пісараў, М. Шалгуноў, Л. Талстой, Ул. Караленка, М. Горкі, М. Мусаргскі, М. Рымскі-Корсакаў, І. Рэпін, Г. Пляханаў, Н. Крупская і многія іншыя шырока вядомыя дзеячы навукі і культуры.

Слаўныя старонкі гісторыі бібліятэкі звязаны з імем Ул. І. Леніна, які быў яе чытачом у 90-я гады. Аб гэтым гаворыць мемарыяльная дошка на фасадзе будынка, а зала, у якой займаўся Уладзімір Ільіч, названа Ленінскай. Вялікі правадыр у 1909 годзе прыслаў з Жэневы ў адрас бібліятэкі дзве пасылкі, у якіх знаходзіліся рэвалюцыйнага зместу брашуры, лістоўкі і нумары газеты «Пролетарий».

У 1913 годзе Уладзімір Ільіч у артыкуле «Што можна зрабіць для народнай асветы» пісаў: «...бачыць гордасць і славу публічнай бібліятэкі не ў тым, колькі ў ёй рэдкасцей, колькі якіх-небудзь выданняў XVI стагоддзя, або рукапісанняў X стагоддзя, а ў тым, як шырока абарачаюцца кнігі ў народзе, колькі прыцягнута новых чытачоў, як хутка задавальняецца любое патрабаванне на кнігу...» У лістападзе 1917 года Ул. І. Ленін падрыхтаваў канкрэтныя прапановы аб перабудове работы публічнай бібліятэкі ў Петраградзе, дзе ўказаў на неабходнасць развіцця кнігаабмену з айчыннымі і замежнымі бібліятэкамі, звярталася ўвага на павелічэнне гадзін работы чытальных залаў і на павелічэнне штату бібліятэкараў.

Дзякуючы клопатам партыі і савецкага ўрада, Дзяржаўная публічная бібліятэка імя М. Я. Салтыкова - Шчадрына стала адной з буйнейшых бібліятэк свету, другой па велічыні бібліятэкай Савецкага Саюза. У сучасны момант яна мае найбольш поўны збор айчынных кніг, часопісаў і газет. Фонды яе налічваюць звыш 14 мільёнаў адзінак захоўвання, сярод якіх ёсць літаратура на 89 мовах народаў СССР, на 30 заходнееўрапейскіх мовах і 126 мовах народаў зарубежнага Усходу. Штодзень у бібліятэку паступае звыш 1 600 кніг і часопісаў, больш 3 000 нумароў газет, выпісваецца больш 7 000 назваў замежных часопісаў. Кнігаабмен устаноўлены з 2 000 арганізацый 73 краін свету.

У калекцыі рэдкіх кніг захоўваюцца каштоўныя беларускія выданні XVI—XVIII стагоддзяў. Сярод іх — кнігі, якія выданы піянерам беларускага кнігадрукавання, буйным вучоным і асветнікам Георгіем Скарыной, выданні 60—80 гадоў XVI стагоддзя Сімеона Буднага, Мацвея Кавечанскага, Васіля Цяпінскага, якія выдалі некалькі царкоўных кніг на беларускай мове ў Нясвіжы і мястэчку Цяпіна. Ёсць поўныя выданні братоў Мамонічаў, якія разгарнулі ў 80-я гады XVI стагоддзя ў Вільні інтэнсіўную друкарскую дзейнасць. У ліку гэтых выданняў — Евангелле і Псалтыр, якія выпушчаны Пятром Мсціслаўцам у 1575 годзе. Вялікую цікавасць маюць нумары газеты «Мужыцкая праўда», якая выдавалася ў 1863 годзе кіраўніком сялянскіх паўстанняў Кастусём Каліноўскім.

Неацэнным багаццем бібліятэкі з'яўляецца яе рукапісны фонд. Тут захоўваецца першы датаваны помнік рускай пісьменнасці «Астрамірава евангелле» (1056—1057), мноства старадаўніх грамат, рукапісы выдатных дзяржаўных дзеячоў, палкаводцаў, пісьменнікаў. Запісы на пальмавых лісцях, папірусе, шоўку, бяросце, скуры і паперы захоўваюць звесткі па гісторыі чалавецтва больш чым за тры тысячагоддзі. Тут жа захоўваюцца і рукапісы беларускіх асветнікаў XI—XII стагоддзяў Кірыла Тураўскага і Кляменція Смаляціча, адзін са старэйшых і рэдкіх помнікаў беларускай мовы—зборнік XV стагоддзя, які мае творы старажытнай беларускай літаратуры, рукапісы вядомага пісьменніка і перакладчыка Сімеона Полацкага.

Дзякуючы міжбібліятэчнаму абанементу багатымі фондамі публічнай бібліятэкі шырока карыстаюцца вучоныя, спецыялісты розных галін ведаў усяго Савецкага Саюза. Толькі ў 1962 годзе 2 037 бібліятэк краіны атрымалі з гэтага сховішча 131 749 кніг, часопісаў і іншых друкаваных выданняў.

Сярод 131 500 чытачоў бібліятэкі, якія запісаліся ў 1962 годзе, многа і людзей, што прыехалі з розных месц краіны і з-за мяжы. Так, у 1962 годзе ў навуковых чытальных залах займалася каля 4 500 прыезджых, у тым ліку 500 чытачоў з замежных краін. У 28 чытальных залах штодзень займаецца звыш 5 тысяч чалавек. Гэта вядомыя вучоныя і маладыя спецыялісты розных галін ведаў, студэнты, рабочыя, служачыя, навучэнцы.

Прапагандзе кнігі і раскрыццю фондаў бібліятэкі садзейнічаюць выстаўкі, лекцыі, канферэнцыі чытачоў, экскурсіі, сустрэчы з дзеячамі навукі, літаратуры і мастацтва, з рэдакцыямі часопісаў і газет. Цяпер пры бібліятэцы ствараецца «Тэатр кнігі», які будзе прапагандаваць лепшыя творы савецкіх і замежных аўтараў.

Дзяржаўная публічная бібліятэка імя М. Я. Салтыкова-Шчадрына з'яўляецца буйнай навукова-даследчай установай краіны ў галіне бібліятэказнаўства, бібліяграфіі і гісторыі кнігі. Многія яе выданні шырока вядомыя і бібліятэкам Беларусі.

Ф. БЫКАВА,
галоўны бібліятэкар Дзяржаўнай публічнай бібліятэкі імя М. Я. Салтыкова-Шчадрына.
Ленінград.

Галоўны будынак бібліятэкі імя Салтыкова-Шчадрына.

[Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.].

ДАРОГІ СКРЫЖАВАЛІСЯ Ў МІНСКУ

дары, — павітаўся Тумаш. — Вельмі прыемна, што вы прыйшлі сюды, каб выказаць сваё аднадумства з нашай вызвольніцай — вялікай нямецкай арміяй,— і ён няспешна, паважна паплыў да старшыньскага стала.

— Вялікі фюрэр, — урачыста і ўзнёсла працягваў Тумаш, падняўшы вочы ўгору, — прынёс нам вольнасць. Таму ад імя беларутэнскага народа мы выказваем яму сваю глыбокую падзяку і шанаванне... А зараз наш сход лічу адкрытым. Сядайце, спадары. Даводжу да вашага ведама, што нямецкімі ўладамі я прызначаны бургамістрам горада Менска. Прашу вас, шаноўныя спадары, памагчы мне. Нам супольна з вамі даручана арганізаваць некалькі аддзелаў. Хто з прысутных які аддзел можа ўзначаліць?

Усе маўчалі, скоса пазіраючы адзін на аднаго. Кожнаму карцела першаму выбраць больш цёплае месца, але ж боязна было, каб не схібіць, не прамахнуцца.

З кутка падняўся невялічкі, кругленькі чалавек у акулярах.

— Прашу вас, спадар... спадар...— знарок запнуўся, быццам забыў яго прозвішча, Тумаш.

— Прафесар Малаў...—падказаў той. — Я заяўляю аб сваёй поўнай лаяльнасці да новай нямецкай улады. Я даўно чакаў яе прыходу, чакаў, бо не мог прыняць Савецкую ўладу...

Малаў лічыў, што яго не ацаніла Савецкая ўлада, што настаў, нарэшце, час, калі можна будзе паказаць сябе, падняцца па службовай лесвіцы. Ён ведаў, што сярод прафесараў не многа знойдзецца такіх, якія пойдуць служыць акупантам, таму немцы павінны высока цаніць яго згоду працаваць з імі.

— Я спецыяліст па фінансах, — падкрэсліў ён. — А вы, панове...

Яго перапыніў Тумаш:

— Цяпер у Беларутэніі прыняты дзяржаўны зваротак не «пан», а «спадар»...

— Прашу прабачэння, спадары...— паправіўся Малаў, — я не ведаў пра гэта. З вашага дазволу, працягваю... Вам, спадары, не трэба тлумачыць, што такое фінансы. Фінансы — гэта душа і цела любога грамадства. На фінансах трымаецца ўсё, літаральна ўсё. Таму я прапаную стварыць пры ўправе фінансавы аддзел. Я згодны ўзначаліць яго...

Астатніх начальнікаў аддзелаў Тумаш прызначыў сам.

— І яшчэ паведамляю, — сказаў ён пад канец, — што маім першым заступнікам, ці, як у вас, у Менску, дагэтуль гаварылі, намеснікам, будзе спадар Адам Дземідзецкі-Дземідовіч. Чалавек ён вельмі спрактыкаваны ў адміністрацыйных справах. Асабістым сакратаром маім і бліжэйшым дарадчыкам прызначаецца спадар Бяленіс. На гэтым будзем лічыць управу сфарміраванай. Прашу, спадары, неадкладна прыступіць да выканання свае вялікай гістарычнай місіі.

Пакрысе пакой апусцеў. Асталіся толькі «варшаўцы», якія гуртам абступілі Тумаша, чакаючы далейшых распараджэнняў. Тумаш доўга збіраўся з думкамі, цёр пукаты лоб, потым кінуў погляд на сваіх супольнікаў і сказаў:

— Спадары, мы паклалі грунт нашай новай справе. Аднак у нас, апроч службовых патрэб, ёсць і асабістыя, аб якіх мы таксама павінны паклапаціцца. Запрашаю вас у дом, адведзены для нас.

Гуртам рушылі да Вакзальнай плошчы. Наперадзе крочыў Тумаш. Ззаду трымаліся астатнія. Паміж бургамістрам і яго падначаленымі ўжо ўтварыўся службовы інтэрвал, пераступіць які ніхто не адважваўся. На былой Ленінградскай вуліцы Тумаш павёў усіх у чатырохпавярховы дом. Падняліся па лесвіцы на другі паверх.

— Тут ваша кватэра, спадар Дземідзецкі-Дземідовіч, — Тумаш паказаў на дзверы. — Вось ваш ключ...— Ён доўга поркаўся ў глыбокай кішэні, перабраў цэлую жменю ключоў, покуль адшукаў патрэбны. Ключ, відаць, толькі нядаўна быў зроблены. Сунуўшы яго ў руку спадара Адама, Тумаш дадаў:

— Абсталяванне ў вас небагатае. Але паклапаціцеся самі. Увогуле, увесь Менск у нашым распараджэнні. Тут шмат кватэр асталося без гаспадароў... Адным словам, толькі не палянуйцеся. Бывайце, да заўтра! Нам вышэй!

Дземідзецкі доўга аглядаў пакоі свае кватэры. Нават пакратаў ногцем тынкоўку, ці трывалая. Потым заглянуў у шафы з бялізнай. Сёе-тое можна было б адправіць жонцы. Але перадумаў. Не ўвесь жа час без жанчыны тут перабівацца. Яніна, жонка, ехаць сюды не схацела. Ды і куды яе, старую драбіну, цягнуць, яшчэ рассыплецца. Яна ж намнога старэйшая за яго, бо ажаніўся спадар Адам на ўдаве, з-за багатага пасагу. Ну, а сам ён яшчэ не зломак, з дзябёлай маладзіцай можа ўправіцца. Дык як жа не мець вартую кватэру для вясёлай часіны.

Аглядзеўшы кватэры настроіў Дземідзецкага на вясёлы лад. Ён нават пачаў мармытаць сабе пад нос «Ешчэ Польска не згінэла», але ў час спахапіўся, што гэтая песня цяпер не ў моадзе, і ў думках аблаяў сябе.

Увечары, улёгшыся ў пасцель і з асалодай зажмурыўшы вочы, Дземідзецкі-Дземідовіч адчуў, што фартуна, нарэшце, павярнулася да яго тварам.

Усе наступныя дні Тумаш і яго світа знаёміліся з горадам. Прадстаўнікі новай улады з дазволу немцаў хадзілі па кватэрах, пакінутых гаспадарамі. З сабой яны бралі былых крымінальнікаў, хто гатоў быў рабіць, што хочаш, каб толькі ўхапіць нейкі кавалак з гаспадарскага стала. А кавалак тут трапляўся ладны.

Дземідзецкі, Тумаш, Лазарэвіч камандавалі, а тыя рабавалі чужыя кватэры і ўвесь скарб цягнулі сваім гаспадарам. У самыя лепшыя свае часы ў Польшчы Дземідзецкі не меў такога багацця. Куфэрак з золатам, плацінай і брыльянтам ён старанна схаваў на кухні. А чамаданы, поўныя дабра, пакінуў у спальні.

Адно турбавала: хаця б які-небудзь шэф СД не надумаў завітаць сюды. Але шэфам было не да яго. Хапала і сваіх клопатаў. Гэта спадар Адам адчуў, калі, выкліканы па іх загадзе, ішоў па калідорах былога інстытута народнай гаспадаркі. Стаяла глухая цішыня. Раптам пачуўся прарэзлівы мужчынскі крык. Спадар Адам здрыгануўся. Яго маленькія вочкі палахліва забегалі, замітусіліся, вусы натапырыліся. Крык паўтарыўся. «Гестапа ёсць гестапа», — падумаў Дземідзецкі.

Адчыніліся дзверы, і на вочы трапіўся Тумаш. Сустрэча з Тумашам у СД не здзівіла спадара Адама. Наадварот, ён нават рады быў, што яны сустрэліся тут. Няхай Тумаш ведае, што і яго заступніку тут адчынены дзверы. Але сёе-тое і турбавала Дземідзецкага. Ён многа даў бы, каб даведацца, ці ёсць у Тумаша патаемныя сувязі з іншымі разведкамі. Які б гэта быў козыр! Сам Дземідзецкі служыў і англічанам. Яго брат Канстанцін — член польскага эміграцыкага ўрада ў Лондане — памог яму стаць актыўным агентам падпольнай польскай Арміі Краёвай.

І не толькі Дземідзецкі быў служкам некалькіх гаспадароў. Па суседству з ім жыў начальнік аддзела кантролю гарадской управы Вітальд Буткевіч. Бацька яго да рэвалюцыі быў буйным арандатарам пад Пухавічамі. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі Буткевічы ўцяклі ў Польшчу. Сам Вітальд працаваў чыноўнікам на таможні ў Гдыні, а ў 1940 годзе, калі немцы акупіравалі Польшчу, прыехаў у Варшаву і ўступіў у Армію Краёву. Потым, па заданню Арміі Краёвай, уступіў у Беларускі нацыянальны камітэт. Дзеля гэтага прыехаў у Бяла-Падляску, дзе стаў адным з кіраўнікоў Бяла-Падляскага цэнтра БНК. Пра ўсё гэта Дземідзецкі даведаўся з усім нядаўна і выпадкова. Пасля аднае ночы, праведзенай у вясёлай кампаніі саслужыўцаў, спадар Адам крыху пазней, чым належала, затрымаўся дома. У дзверы ціхенька пастукалі. Ён насцярожыўся, сунуў руку ў кішэню, дзе заўсёды ляжаў пісталет, і спытаў:

— Хто?

— Будзьце ласкавы, паночку, на адно слова, — пачуўся лагодны мужчынскі голас з выразным польскім акцэнтам.

Адчыніўшы дзверы, Дземідзецкі ўбачыў на калідоры двух цывільных. Адзін з іх, той, што быў бліжэй, назваў пароль Арміі Краёвай.

— Пшэпрошам! — Дземідзецкі запрасіў гасцей у пакой. — З кім маю гонар? — спытаў ён, зачыніўшы дзверы.

— Прабачце, вы будзеце пан Вітальд Буткевіч?

— Здарылася прыкрая памылка, панове, — нездаволена адказаў Дземідзецкі. — І ваша шчасце, што вы трапілі да мяне. А то за такія памылкі людзі плацяць галавой. Кватэра Вітальда Буткевіча—побач... Але наперад раю быць больш асцярожнымі. Зараз пана Вітальда вы дома не знойдзеце, ён ва ўправе. Давядзецца пачакаць.

Пасля гэтага выпадку Дземідзецкі прыглядаўся да кожнага служачага ўправы і варажыў: «А гэты — таксама?» І таму вельмі цікавіла яго пазіцыя Тумаша. У якой ступені можна быць з ім шчырым? Ці не служыць і ён двум гаспадарам адначасова?

Не, шчырым ні з кім нельга быць. Тут кожны і д'ябла ашукае і богу недадасць.

ШЭФСТВУЮЦЬ НАСТАЎНІКІ

Настаўнікі Пірэвіцкай школы Жлобінскага раёна ўзялі шэфства над сельскімі ўстановамі культуры. Іх высакародны пачын знаходзіць усё больш шырокае распаўсюджанне ў нашай вобласці. Аднак хутка мы пераканаліся, што аднаго энтузіязму тут недастаткова. Настаўнікам неабходны спецыяльныя веды. Вось і вырашылі ў дні зімовых школьных канікулаў правесці семінар настаўнікаў—кіраўнікоў мастацкай самадзейнасці.

Чатыры дні сельскія настаўнікі і піянерважатыя развучвалі новыя песні, бальныя і сцэнічныя танцы, маслухалі лекцыі: «Віды і жанры мастацтва», «Роля школы ва ўзняцці культуры на вёсцы», «Задачы ўстаноў культуры ў святле рашэнняў чэрвеньскага Пленума ЦК КПСС». Метадысты правялі гутаркі аб тым, як працаваць з харавымі, танцавальнымі, драматычнымі гурткамі і з агітбрыгадай.

Удзельнікі семінара падзяліліся вопытам, як яны памагаюць сельскім клубам. Цікавыя справы ў настаўніку вёскі Вітчын Жыткавіцкага раёна. Настаўнікі тав. Янчкіна кіруе танцавальным гуртком, тав. Галіна—драматычным, тав. Мірановіч — харавым. Нядрэнна працуе тут агітбрыгада, якая выязджала з канцэртамі на сенакосы, на палявыя станы, у суседнія вёскі. Цяпер школа сумесна з клубам рыхтуе тэматычны вечар «Хімія—шырокую дарогу».

Настаўнікі Азарыцкай школы Калінкавіцкага раёна — актыўныя ўдзельнікі і кіраўнікі калектываў мастацкай самадзейнасці пры Доме культуры. Агітбрыгада зрабіла 13 выступленняў. Працуе універсітэт культуры.

Апроч тэарэтычных і практычных заняткаў, удзельнікі семінара сустрэліся з кіруючымі работнікамі ўпраўлення культуры і аддзела народнай асветы сельскага аблвыканкома, а таксама пабывалі ў тэатры, краязнаўчым музеі, на балі настаўнікаў у Палацы піянераў, прысутнічалі на тэматычным вечары «Плюс хімізацыя» ў Яромінскім сельскім Доме культуры Гомельскага раёна, на рэпетыцыях мастацкіх калектываў Палаца культуры чыгуначнікаў імя Ул. І. Леніна.

Метадысты Дома народнай творчасці паклапаціліся аб тым, каб забяспечыць удзельнікаў семінара літаратурай. Настаўнікі павезлі з сабою зборнікі песень «Па-над Сожам галасы», «У дапамогу калектывам мастацкай самадзейнасці», альбом «Мастацкае афармленне ў клубе», метадычныя распрацоўкі: «Я — грамадзянін Савецкага Саюза», «Як правесці камсамольска-маладзёжнае вяселле ў клубе», сцэнарыі для агітбрыгад: «Рэлігія —опіум для народа», «Увойдзе законам нашага новага жыцця маральны кодэкс у кожную сям'ю», брашура «Выкарыстанне фальклору ў рэпертуары агітбрыгады».

На жаль, не ва ўсіх раёнах вобласці сур'ёзна ставяцца да шэфства настаўнікаў над установамі культуры. З Петрыкаўскага і Мазырскага раёнаў на семінар у Гомель ніхто не прыехаў. Не думаю, каб у гэтых раёнах не было надаючых прыняць удзел у нашым семінары.

І. КАПОЦЯ,
дырэктар Гомельскага абласнога Дома народнай творчасці.

14 студзеня

Першая праграма. 11.30 — «Чырвонае чарніла». Мастацкі фільм. 16.45 — «Сельская навіна» (М). 17.15 — «Расліны без зямлі». Аб вырошчванні раслін гідрапонным спосабам. 17.30 — праграма перадач. 17.35 — «Гаворыць маладыя вучоныя». Гутарка за «круглым сталом». 17.55 — «Пры святле дня». Тэлевізійная пастаноўка. 19.00 — канцэрт. 21.00 — кіначасопіс. 21.10 — «Хутчэй, вышэй, далей». Спартыўны выпуск. 22.00 — «Майстры мастацтваў». Творчы вечар артысткі Ленінградскага Вялікага драматычнага тэатра імя М. Горкага Т. Даронінай. Перадача з Ленінграда. 22.30 — тэлевізійныя навіны (М).

Другая праграма. 11.30 — для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў. «Падарункі сяброў», «Пастушка і камінар», «Новае плацце караля». Чэхаславацкія фільмы па казках Андэрсена (М). 17.15 — тэлевізійныя навіны (М). 17.30 — для школьнікаў. «Шлях да музыкі». Перадача з Ленінграда. 18.00 — за старонкамі падручніка. «Пушыстае золата». 18.30 — «Навука — вытворчасці». Тэлечасопіс (М). 19.00 — Р. Корнеў. «Пярсцёнак». Прэм'ера тэлеспектакля Петразаводскай студыі (М). 20.00 — творы, вылучаныя на атрыманне Ленінскай прэміі 1963 года. Я. Ісаеў. «Суд памяці». Літаратурны тэатр (М). 20.50 — «Зарубежны раманс». Э. Грыг (М).

15 студзеня

Першая праграма. 11.30 — «Далёка ад радзімы». Мастацкі фільм. 17.25 — праграма перадач. 17.30 — «Вучоба і праца». Кінанарыс. 17.50 — тэлевізійныя навіны. 18.00 — Рашэнні Пленума ЦК КПСС — у жыццё. «Даступна кожнай гаспадарцы». 18.25 — на стадыёнах і спартыўных пляцоўках. Хакей: СССР—Канада. Перадача з Палаца спорту (М). 20.30 — «Свет сёння» (М). 21.00 — «Школа гаспадарання». Тэлевізійная перадача. 21.30 — тэлевізійныя навіны (М). 22.00 — аматарам шашак. 22.20 — канцэрт артыстаў Свярдлоўскага тэатра оперы і балета.

Другая праграма. 11.30 — «На прасторах Радзімы». Кінарэпартаж (М). 11.40 — «Нашы крылатыя памочнікі». Кінанарыс (М). 17.10 — праграма перадач (М). 17.15 — тэлевізійныя навіны (М). 17.30 — для школьнікаў. «Сто задум двух сяброў» (М). 17.55 — за старонкамі падручніка. «Праменні жыцця». Тэлевізійны нарыс аб электрычным святле (М). 18.25 — «Барба». Тэлевізійны спектакль. 20.15 — «Жызель». Сцэны з балета. 20.35 — «Архітэктурныя ансамблі Ленінграда». Тэлевізійны нарыс. 21.00— канцэрт артыстаў балета. Перадача з Сафіі (М). 21.30 — тэлевізійныя навіны (М). 22.00 — «У эфіры — «Маладосць». «Думаем, спрачаемся, абмяркоўваем» (М).

16 студзеня

Першая праграма. 17.30 — праграма перадач. 17.35 — тэлевізійныя навіны. 17.50 — «У глыбіні сібірскіх руд». Навукова-папулярны фільм. 18.10 — адказваем на вашы пытанні. «Хімія